www.nv-online.info

№ 37 (4084)

17 мая 2016 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадо...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету у офісе рэдакцыі — чакаем!

ІДЗЕ МЕСЯЧНІК

Далучым да «Народнай Волі» новых чытачоў!

Рэдакцыя ўжо неаднойчы звярталася да шаноўных падпісчыкаў газеты і ўсіх тых, хто рэгулярна купляе яе ў шапіках, з настойлівай просьбай: давайце разам пашырым кола прыхільнікаў "Народнай Волі". Месячнік па мабілізацыі новых чытачоў, які мы аб'явілі, блізіцца да завяршэння, але нагадваем, што да 26 мая яшчэ застаецца пэўны час. У таго, хто падпішацца да гэтай даты, ужо з 1 чэрвеня "Народная Воля" будзе ляжаць на стале.

Падпіску можна аформіць у любым паштовым аддзяленні, а ў Мінску – яшчэ і ў спецыялізаваных пунктах "Белсаюздруку".

"Народная Воля" – газета для народа!

СПЕЦОБЪЕКТ

Для особо избранных

О том, что в курортной зоне рядом с поселком Ждановичи, примыкающем к Минску, появится новая спецбольница для чиновников самой высокой касты и «особо заслуженных» людей, «Народная Воля» писала не раз. Напомним, в суперроскошном медцентре будут созданы такие удобства для пациентов, о которых те, кто лечится в обычных районных, городских больницах, и мечтать не могут. В спецклинике запроектированы не просто VIP-палаты, а целый такой блок в отдельном крыле с двумя индивидуальными выходами, отдельным лифтом, с кухней, столовой, помещениями для охраны, медперсонала и т.д.

В Полоцке, например, из-за дефицита денег вот уже лет семь не могут достроить здание родильного отделения. А тут под Минском в лесу вскоре будет возведена не просто спецбольница, а, можно сказать, огромный лечебный комплекс. Строительные и отделочные работы ведутся без перерыва, не жалея ни сил, ни денег. Сообщалось, что обойдется новая спецклиника для власть имущих в 100 миллионов долларов. А мало будет – деньги найдутся, это же не для полоцкого роддома.

Понятно, попасть на «секретный» объект оказалось не так-то просто. Со всех сторон стройка обнесена высоким забором с камерами видеонаблюдения. Охрана – круглосуточная! Словом, стройка не для глаз людских. Действительно, зачем дразнить обычных граждан, которые часами мучаются в очередях в поликлиниках, испытывают немало трудностей при лечении в обычных больницах? Это они, рядовые граждане, ютятся по шесть-семь человек в палатах без кондиционеров, а здесь, в лесу под Минском, будет рай для особо избранных.

Посмотрите на снимок, который журналисту **Алесю Сивому** удалось сделать на днях. На нем – стройка этой самой элитной больницы. Удалось убедиться, что работа на самом деле кипит, уже практически возведены все корпуса заведения. Размах, конечно, впечатляет.

Кстати, пару месяцев назад наш корреспондент также пытался сфотографировать "объект", но дело закончилось тем, что "прорабы" с рациями в руках заставили его стереть в фотоаппарате все кадры и "удалиться с территории". На этот раз фото приходилось делать из близлежащего леса, маскируясь от греха подальше в кустах. Не хотелось отвлекать от работы тех, кто сегодня трудится на объекте "стратегически важного для страны значения".

ВІЗІТ

Учора ў Мінску адбылася сустрэча міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова з прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем.

АНОНС

Мікола КУПАВА:

У Беларусі дагэтуль няма ніводнага цалкам беларускамоўнага тэлеканала. А яны ж у пэўнай форме існавалі яшчэ ў савецкую пару, ды былі знішчаны. Між тым ва Украіне існуюць блізу 20 нацыянальных тэлеканалаў; у Літве, амаль утрая меншай па тэрыторыі за Беларусь, – каля 10. Нам патрэбна напачатку хаця б 3–4 беларускамоўныя тэлеканалы.

(Поўны тэкст артыкула М.Купавы "Адродзім беларускую школу" чытайце на 4-й стар.)

ПАРАЛЛЕЛИ

Никаких закрытых госбольниц для привилегированных лиц…

«Народная Воля» решила выяснить, где лечатся президенты и высокие государственные чиновники в других странах

Аналога такому специализированному медицинскому центру, как белорусская «лечкомиссия», в развитых странах не существует. В Германии, например, канцлер и другие высокопоставленные лица не имеют закрытой государственной клиники. Они, как и все граждане страны, прибегают к услугам частных врачебных кабинетов, то есть обычных семейных врачей, или научно-исследовательских центров, общедоступных клиник. То есть никаких госбольниц для привилегированных лиц в Германии нет и в помине.

Во Франции и Испании госчиновники лечатся в дорогих приватных клиниках, число которых значительно превышает государственные. Однако большой разницы в условиях между этими двумя типами учреждений нет – отличие заметно разве что в цене услуг. В большинстве европейских стран введено обязательное медицинское страхование для всех граждан. Такая страховка (обычно в виде пластикой карточки) дает право на бесплатное амбулаторное и стационарное лечение. А госпитали заключают договоры с определенными страховыми компаниями, за счет чего и работает такая система.

Главы европейских государств чаще всего имеют личного семейного врача, который ведет историю болезни и выписывает необходимые лекарства. Безусловно, в Европе много клиник «для избранных», однако все они принадлежат частным лицам либо компаниям, а не государственной структуре, имеющей отношение к бюджетным средствам. Плати деньги и лечись, где хочешь.

Катерина АНДРЕЕВА.

ФОТАХРОНІКА

Падчас правядзення ўступнай сесіі Кангрэса дэмакратычных сіл у скверы імя Янкі Купалы ў Мінску.

Акцыя "Праспект нацыянальнага сцяга" на Кастрычніцкай плошчы.

СУД!

Прызнаны вінаватым за хабар

Былы намеснік старшыні Лідскага райвыканкама **Антон Глаўніцкі** прызнаны вінаватым у злоўжыванні ўладай і атрыманні хабару. Ён прыгавораны да 7,5 года пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй усёй маёмасці.

Абвінавачаным па справе таксама праходзіў былы намеснік старшыні Траццякоўскага сельскага выканаўчага камітэта Лідскага раёна **Сяргей Мікулко.** Суд прысудзіў яго да 5,5 года пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй усёй маёмасці. Абодва чыноўнікі з красавіка 2013-га па сакавік 2015 года падшуквалі грамадзян, якія жадаюць выехаць у краіны Заходняй Еўропы, і, выкарыстоўваючы службовае становішча, аказвалі ім садзейнічанне ў атрыманні шэнгенскіх віз.

За свае паслугі чыноўнікі атрымалі не менш за 235 мільёнаў беларускіх рублёў.

Акрамя таго, карыстаючыся службовымі паўнамоцтвамі, Антон Глаўніцкі некалькі разоў прыцягваў рабочага Бярозаўскага гарвыканкама да работы на сваёй дачы без аплаты паслуг.

Абодвум асуджаным забаронена займаць пасады, звязаныя з выкананнем паўнамоцтваў прадстаўніка ўлады, і пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў, тэрмінам на 5 гадоў.

Кірыл БУБНОЎ.

ПАЗІЦЫЯ

Абмяркуем разам!

Як вядома, напрыканцы мінулага тыдня група лідараў і актывістаў апазіцыі падпісала Дэкларацыю ў падтрымку незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Праўладныя сродкі масавай інфармацыі замоўчваюць гэтую падзею, яна знайшла асвятленне толькі ў шэрагу незалежных электронных сайтаў.

Магчыма, свае слова яшчэ скажуць аналітыкі, грамадскасць. "Народная Воля" лічыць мэтазгодным даць дакумент не ў пераказе, а ў поўным аб'ёме, без скарачэнняў, з захаваннем стылю. Прапануем, сябры, не толькі прачытаць яго, але і выказаць сваю пазіцыю.

Паколькі размова ідзе пра лёс краіны, то, мяркуем, раўнадушных не павінна быць.

Пішыце, з чым вы згодны, а па якіх пунктах не можаце пагадзіцца, як вы ўяўляеце тую ці іншую сітуацыю, шляхі вырашэння той ці іншай праблемы. Адным словам, распачынаем дыскусію.

Дэкларацыя ў падтрымку незалежнасці Беларусі

Рэспубліка Беларусь – еўрапейская дзяржава, незалежнасць і суверэнітэт якой прызнаны міжнароднай супольнасцю.

Рэспубліка Беларусь дэкларавала аднаўленне сваёй незалежнасці 27 ліпеня 1990 года і заканадаўча замацавала яе 25 жніўня 1991 года. Пасля спынення існавання СССР Беларусь стала паўнапраўнай незалежнай дзяржавай, здабыла дзяржаўны суверэнітэт.

Упершыню за многія гады незалежнасць і дзяржаўнасць Беларусі была аформлена ў адпаведнасці з усімі нормамі міжнароднага права і здабыла міжнароднае прызнанне.

Беларусы атрымалі магчымасць самім вызначаць свой лёс.

Рэспубліка Беларусь стала правапераемніцай не толькі і не столькі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая ўваходзіла ў склад СССР, колькі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), якая была абвешчана 25 сакавіка 1918 года.

БНР праіснавала ўсяго некалькі месяцаў як дэкларацыя намеру беларускага народа пабудаваць сваю незалежную дзяржаву. Гэтае імкненне беларусаў было здушана бальшавікамі, якія стваралі савецкую дзяржаву, а фактычна – адраджалі Расійскую імперыю ў больш жорсткай, таталітарнай форме.

Створаная 1 студзеня 1919 года Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка была створана ўладай бальшавікоў у процівагу Беларускай Народнай Рэспубліцы, каб не дапусціць нацыянальнага адраджэння і ўсталяваць кантроль над тэрыторыяй бытавання беларусаў. Беларусы былі пазбаўлены права бараніць свае нацыянальныя інтарэсы. Асабліва цынічна гэта прадэманстраваў Рыжскі трактат 1921 года, у выніку якога беларусаў пазбавілі большай часткі тэрыторый, а дэлегацыі Беларусі нават не дазволілі ўдзельнічаць у гэтых рабаўніцкіх перамовах.

Беларусь гвалтоўна апынулася ў складзе СССР, што можна класіфікаваць як акупацыю.

Вялікія заходнія дзяржавы, якія нейкі час не прызнавалі СССР, у канчатковым выніку прызналі яго цалкам, тым самым прызнаўшы акупацыю Беларусі, Украіны ды іншых «савецкіх рэспублік».

Пасля пакта Рыбентропа–Молатава 1939 года СССР аднавіў сваю экспансію, вынікам якой стала акупацыя дзяржаў Балтыі: Латвіі, Літвы, Эстоніі.

Заходнія дзяржавы, перш за ўсё ЗША, не прызналі гэтую акупацыю. Тагачасны намеснік дзяржсакратара ЗША **Самнэр Уэлс** 23 ліпеня 1940 года апублікаваў адпаведную афіцыйную заяву, што паклала пачатак працяглай палітыцы непрызнання савецкай акупацыі і анексіі. Гэта дало людзям Эстоніі, Латвіі і Літвы сілы і веру ў працяг барацьбы за свабоду.

Незалежная Беларусь адбылася, але сёння ёй зноў пагражае небяспека. Крыніцай гэтай небяспекі з'яўляецца кіраўніцтва Расіі. Агрэсія Расіі супраць Украіны, анексія Крыма і ваенныя дзеянні ў мэтах акупацыі ўсходніх абшараў Украіны дэманструюць наяўнасць у кіраўніцтва Расіі планаў захопу тэрыторый іншых дзяржаў вайсковымі метадамі і поўнае грэбаванне міжнародным правам.

Расія планамерна разбурае сістэму міжнароднага права, якая склалася пасля Другой сусветнай вайны, парушае міжнародныя пагадненні і дамоўленасці, якія гарантуюць міжнародную бяспеку.

У выніку расійскай агрэсіі ва Украіне быў фактычна знішчаны Будапешцкі мемарандум, згодна з якім ядзерныя дзяржавы – Расія, ЗША і Вялікабрытанія – запэўнівалі, што будуць «устрымлівацца ад пагрозы сілай або яе выкарыстання супраць тэрытарыяльнай цэласнасці або палітычнай незалежнасці Украіны і што ніякія іх узбраенні ніколі не будуць выкарыстаны супраць Украіны».

Такія ж запэўніванні гэтыя ядзерныя дзяржавы далі і Рэспубліцы Беларусь. Поўнае ігнараванне сваіх міжнародных абавязацельстваў Расіяй і адсутнасць якіх-небудзь дзеянняў у сувязі з Будапешцкім мемарандумам з боку іншых ядзерных дзяржаў, што падпісалі яго, стварыла небяспечны прэцэдэнт, які нясе пагрозу незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь.

Міжнародна-прававое становішча Беларусі ў геапалітычнай сітуацыі ўскладняецца тым, што ў краіне не існуе легітымнай улады: ні заканадаўчай, ні выканаўчай, ні судовай. У 1996 годзе шляхам незаконнага рэферэндуму ўлада ў Беларусі была ўзурпіравана Аляксандрам Лукашэнкам. Падзел улад быў знішчаны, і ўся ўлада была сканцэнтравана ў руках узурпатара.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ: «У апазіцыі ёсць людзі, якія выдатна прамаўляюць толькі лозунгі»

На восень запланавана справаздачна-выбарчая канферэнцыя руху "За Свабоду", на якой будзе абрана новае кіраўніцтва арганізацыі. Ці сыдзе Аляксандр Мілінкевіч з палітыкі? І калі так, дык каго ён рыхтуе ў пераемнікі? Навошта прадстаўнікі руху ідуць на парламенцкія выбары, калі выбарчае заканадаўства не зменена і відавочна, што выбары адбудуцца па добра вядомым сцэнарыі? Чаго не хапае беларускай апазіцыі для поспеху? На гэтыя і іншыя пытанні "Народнай Волі" адказаў пакуль яшчэ старшыня руху "За Свабоду", экс-кандыдат у прэзідэнты на выбарах 2006 года Аляксандр Мілінкевіч.

[illegible]

Марына КОКТЫШ.

Я ВАМ ПІШУ…

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі

[illegible]

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Мікалай АЎТУХОВІЧ: «Я не адразу пагадзіўся ўзначаліць рух…»

Былы палітвязень, а зараз вядомы ваўкавыскі прадпрымальнік распавёў "Народнай Волі" пра сваю новую пасаду.

[illegible]

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

НУ І НУ!

Нянькчыць унукаў? Цяпер за грошы!

Мінчанка Святлана Пазняк стала першай сталічнай бабуляй, чыя праца аплачваецца.

[illegible]

Максім ПЛОТНІКАЎ.

КУЛУАРЫ

Исключат ли Юрия Чижа из президентского Совета по развитию предпринимательства?

Подписали ли известные предприниматели поручительство за владельца группы компаний «Трайпл» Юрия Чижа, который с 11 марта находится в СИЗО КГБ? Исключат ли бизнесменов, которые попали под прицел правоохранительных органов, из Совета по развитию предпринимательства, который возглавляет Петр Прокопович? Кто может сменить Прокоповича? Почему заседания совета уже несколько раз переносились? На эти и другие вопросы «Народная Воля» попросила ответить сопредседателя союза юридических лиц «Республиканская конфедерация предпринимательства», члена Совета по развитию предпринимательства **Виктора Маргелова.**

[illegible]

Марина КОКТЫШ.

Для справки

[illegible]

ПАЗІЦЫЯ

Дэкларацыя ў падтрымку незалежнасці Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прысвоіўшы сабе ўсю ўладу ў Беларусі, Лукашэнка стварыў рэжым татальнага кантролю над грамадствам, які вылучаецца сталым і грубым парушэннем правоў чалавека. У эканоміцы рэжым Лукашэнкі вярнуў Беларусь у часы савецкай загаднаадміністрацыйнай сістэмы, якая не толькі замарудзіла развіццё краіны, але і спрычынілася да сістэматычных крызісаў.

Рэжым Лукашэнкі моцна прывязаў Беларусь да Расіі, не толькі эканамічна, але і палітычна, і ў вайсковым аспекце. На гэтым гістарычным адцінку, які характарызуецца агрэсіўнаэкспансіяністскімі паводзінамі расійскага кіраўніцтва, такая залежнасць ставіць пад пагрозу само існаванне Беларусі.

Пасля ўвядзення ў Рэспубліцы пасады прэзідэнта і абрання на яе Лукашэнкі ў Беларусі прайшлі тры рэферэндумы, чатыры разы праводзіліся прэзідэнцкія выбары і чатыры разы – парламенцкія. Ніводны з гэтых выбараў і рэферэндумаў не быў прызнаны міжнароднай супольнасцю, перш за ўсё назіральнікамі ад АБСЕ, пастановы якой абавязана паважаць Беларусь як паўнапраўны яе чалец. Інстытут выбараў як спосаб народнага волевыяўлення ў Беларусі знішчаны. Узурпатар улады Лукашэнка не мае законнага права прадстаўляць народ Беларусі ў міжнародных стасунках. Рэжым Лукашэнкі дзейнічае толькі ва ўласных інтарэсах, у мэтах утрымання асабовай улады дыктатара. Для захавання ўлады Лукашэнка, не маючы на тое законнага права, уцягвае Беларусь у небяспечныя палітычныя, эканамічныя і вайсковыя пагадненні.

Для незалежнасці Рэспублікі Беларусь сёння існуе падвойная пагроза: агрэсіўная палітыка Расіі і незаконны рэжым Лукашэнкі.

У сітуацыі, якая склалася, дэмакратычная апазіцыя, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, незалежныя прафсаюзы

– канстатуючы адсутнасць у Рэспубліцы Беларусь законна абранай улады;

– грунтуючыся на сваёй адказнасці за лёс Рэспублікі Беларусь;

– грунтуючыся на тым, што ў рэгіёне, да якога належыць Беларусь, склалася напружаная сітуацыя ў выніку ўзброенай агрэсіі супраць незалежнай Украіны;

– нагадваючы пра непахіснасць прынцыпаў міжнароднага права і міжнародных прынцыпаў абароны незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў;

– канстатуючы сістэматычныя і сістэмныя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі з боку кіроўнага рэжыму і нагадваючы ў сувязі з гэтым тэзісы Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека аб тым, што правы чалавека павінны ахоўвацца «ўладай закона з мэтай забеспячэння таго, каб чалавек не быў вымушаны ўжываць у якасці астатняга сродку паўстанне супраць тыраніі і прыгнёту»;

– грунтуючыся на тэзісе Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека аб тым, што «воля народа павінна быць падмуркам улады ўрада; гэтая воля павінна знаходзіць сваё выяўленне ў перыядычных і нефальсіфікаваных выбарах»

1.Пацвярджаюць непахіснасць тэзісаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 1990 года, сярод іншага тэзіса аб «вяршэнстве народа ў вызначэнні свайго лёсу».

2.Пацвярджаюць міжнародныя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь, сярод іх замацаваны ў Статуце ААН абавязак устрымлівацца ў міжнародных дачыненнях ад «пагрозы сілай або яе выкарыстання супраць тэрытарыяльнай недатыкальнасці або палітычнай незалежнасці кожнай дзяржавы».

3.Заяўляюць аб тым, што міжнародныя пагадненні дзяржавы павінны ўважацца за законныя і міжнародна прызнаныя толькі пасля іх падпісання і зацвярджэння легітымнымі органамі ўлады, якіх на гэты момант у Рэспубліцы Беларусь няма.

4.Заяўляюць пра тое, што ўдзел Беларусі ў геапалітычных звязах, якія супярэчаць нацыянальным інтарэсам, спрычыніўся да імклівага збяднення насельніцтва.

5.Заяўляюць аб тым, што ніякія дзеянні або пастановы нелегітымнай улады, якія пагражаюць незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, не павінны разглядацца як законныя і прызнавацца міжнароднай супольнасцю.

6.Нагадваюць удзельнікам Будапешцкага мемарандума 1994 года, перш за ўсё ЗША і Вялікабрытаніі, аб змешчаных у ім тэзісах аб абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь.

7.Звяртаюць увагу міжнародных арганізацый – ААН, АБСЕ, Еўрапейскага Звязу, Рады Еўропы – на тое, што адсутнасць у народа Беларусі права на свабоднае волевыяўленне не дазваляе ставіцца да цяперашняга рэжыму як да паўнапраўнай ўлады, якая прадстаўляе дзяржаву ў міжнародных дачыненнях.

8.Сцвярджаюць, што Рэспубліка Беларусь стане паўнапраўным удзельнікам міжнародных стасункаў толькі пасля правядзення ў краіне свабодных выбараў.

9.Заклікаюць АБСЕ, Еўрапейскі Звяз рашуча патрабаваць выканання дзейным урадам Беларусі рэкамендацый Бюро дэмакратычных інстытутаў і правоў чалавека АБСЕ аб правядзенні выбараў.

**Мікола СТАТКЕВІЧ,
Вячаслаў СІЎЧЫК,
Вацлаў АРЭШКА,
Віталь РЫМАШЭЎСКІ,
Андрэй САННІКАЎ,
Максім ВІНЯРСКІ,
Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА,
Алена ЯСЬКОВА,
Генадзь ФЯДЫНІЧ,
Зміцер ДАШКЕВІЧ,
Станіслаў ШУШКЕВІЧ,
Уладзімір НЯКЛЯЕЎ.**

ПЕРСОНА

Военный историк

25 вопросов профессору Академии МВД Анатолию Шаркову, который, преодолев негативные стереотипы времени, первым стал изучать положение военнопленных Великой Отечественной – в том числе и вражеских солдат

Лишь спустя десятилетия после Великой Победы у общества и государства появилась потребность знать не только об участниках героических сражений, но и о военнопленных, и о тех, кто был угнан в рабство на чужбину, и об интернированных. Они – страдальцы войны и требуют от нас в первую очередь элементарного человеческого сочувствия.

Досье «Народной Воли»

Анатолий Васильевич Шарков – доктор исторических наук, профессор Академии МВД, полковник милиции в отставке. Находился в Чернобыльской зоне в июне 1986 года.

Один из разработчиков уголовно-исполнительного кодекса. Написал первый учебник по уголовно-исполнительному праву. Издал несколько книг: о Первой мировой войне, о судьбах военнопленных Второй мировой войны. За книгу-реквием «Жить и помнить», написанную в соавторстве с Еленой Хорошевич, в которой обобщены итоги изучения захоронения белорусов – защитников Отечества в разных уголках Европы, удостоен премии Президента Республики Беларусь «За духовное возрождение».

1. – Почему до сих пор многие архивы засекречены, документы по истории Второй мировой войны скрываются?

– А кто вам сказал, что они закрыты или засекречены? Я лично не вижу проблем, чтобы посетить любой из архивов – в России или Европе. Все услуги теперь на платной основе. И в архивах Беларуси вам также выдадут любой документ. Конечно, если взять архив КГБ, МВД, то там есть засекреченная, сугубо служебная, профессиональная информация. Но она существует в любом государстве мира! А вообще, в наших архивах действуют ограничения этического аспекта: нельзя снимать копии личных документов по просьбе других лиц. Конкретно ваших родственников – пожалуйста, берите и делайте копии. А если это документы других лиц – нет. Но для исследовательской научной работы, впрочем, доступны и они.

2. – Как вы считаете, остались в Европе неизвестные воинские некрополи советских солдат времен Великой Отечественной войны?

– Да, еще не все захоронения последней войны учтены. Но такая работа активно проводится Россией. Развита эта деятельность в Германии, Австрии. В Чехии, Словакии, Польше слабее. Там много мелких военных захоронений. В связи с тем или иным строительством они переносятся в более крупные. Нет, останки не уничтожаются, я бы этого не сказал. Но должного почета, статуса у них уже нет… Хотя бывает, как в Польше: под видом перезахоронений кое-где идет просто грубый демонтаж.

3. – А в Польше – это что, желание отомстить, уязвить побольнее сегодняшнюю Россию?

– Сами граждане Польши, по-моему, относятся к памяти погибших советских воинов очень уважительно. Сколько мы проехали европейских государств, везде местное население помнит о погибших, показывает, рассказывает о воинских захоронениях. А снос, перенос – как памятник генералу Черняховскому – это уже дела политиков.

4. – На территории какой страны лучше всего сохраняются памятники погибшим советским воинам?

– Конечно, надо отдать должное Германии и Австрии. Но есть нюанс, где конкретно находятся воинские захоронения. Если в столице, крупном городе, то все сделано добротно и уважительно. Например, к Варшавскому мемориалу до сих пор приходят люди с цветами, и даже приезжают издалека, чтобы разыскать своих родных. Но если чуть в сторону… Возьмите ту же известную Остроленку в Мазовецком воеводстве Польши. Там уже и запустение, и не подкошена трава, и памятники не поправлены.

5. – Отношение к могилам чужих воинов – в этом тоже проявляется культура нации, правда?

– Конечно! У нас с Германией в 1996 году подписано соглашение об уходе за воинскими захоронениями. Стороны обязались ухаживать за могилами павших воинов, а также военнопленных, невзирая на политические, идеологические нюансы. Немцы соблюдают его. Мы, в общем, тоже. Хотя соглашение по известным причинам нами до сих пор не ратифицировано. И я понимаю ветеранов, которые против… Они имеют на это право. И на деле этот факт совершенно не препятствует нормальному отношению к захоронениям врагов. У нас надзор за немецкими могилами проводит Народный *союз* Германии по уходу за военными *захоронениями.*

6. – У нас что, есть обозначенные захоронения немецких солдат и офицеров?! Я никогда их не видела.

– В Беларуси свыше 77 захоронений немецких военнопленных времен Великой Отечественной. Но они нигде не обозначены. Только на бумаге. И если в тех местах начинают строительство или другие земляные работы и на поверхность поднимают останки, то тогда останки перезахоранивают. Для этого есть два сборных кладбища: в Щатково под Бобруйском и в Березе Брестской области.

7. – А кто инициировал поиск белорусов в братских могилах Европы?

– Наш проект проводился под эгидой Всехсвятский церкви и конкретно с благословения отца Федора Повного. Это вообще его идея: в храме даже есть крипта, в которой хранится земля из мест, где воевали и погибли наши соотечественники. Но мы искали не только белорусов, погибших в боях, но и белорусов-военнопленных, погибших на территории Европы и похороненных на чужбине, принудительно угнанных и навечно оставшихся там рабочих, несовершеннолетних детей. Подобная книга первая не только у нас, но и в России. Когда приезжал в Минск Зюганов, восхищался нашей работой, а потом у себя дома ставил нас в пример. И проект будет продолжаться! Мы посетили только семь стран и только знаковые места. А белорусские захоронения разбросаны по 49 державам.

8. – Кто помогал в ваших поездках?

– Церковь, Всехсвятский приход. Общественные организации Германии. И самую большую помощь оказал «Приорбанк». В книге «Жить и помнить» всем написаны слова благодарности.

9. – Сколько белорусов захоронено на чужбине? Есть хоть примерная цифра?

– Нет пока, к сожалению… Мы впервые стали заниматься этой проблемой.

10. – Раньше говорили, что в Беларуси погиб каждый четвертый. Потом – каждый третий. А вы, военный исследователь, как думаете?

– Думаю, погиб каждый третий… Много. А если еще посчитать тех, кто из-за войны не родился, а мог бы появиться на свет…

11. – В первые месяцы войны в плен, как известно, попали миллионы советских солдат. И поначалу, читала, их на оккупированных территориях даже освобождали: белорусов и украинцев отпускали домой. Это так?

– Да, особенно если родственники приходили и забирали, выкупали.

12. – А почему потом фашисты стали их так жестоко уничтожать?

– На оккупированных территориях началось партизанское сопротивление! Куда ж было отпускать из лагерей военных… Гитлеровцы стали специально морить их голодом. Вообще, их военная машина не была готова к такому огромному числу военнопленных. Впрочем, советская сторона тоже – у нас просто не было сил кормить еще и пленных гитлеровской армии…

13. – Вы единственный, кто собирал материал и написал книгу о гитлеровских военнопленных на нашей территории. Сколько их было в Беларуси?

– Военнопленных, содержащихся в лагерях, – свыше 77 тысяч. Кроме этого были еще рабочие батальоны, а также отдельные рабочие батальоны. В целом в Беларуси свыше 103 тысяч человек.

14. – А можно доверять архивным цифрам? Ведь составлялись они практически в экстремальных условиях.

– Процент погрешности есть в любой статистке. Но надо сопоставлять наши отчеты и немецкие отчеты. Впрочем, и у них по одному и тому же событию встречаются разные цифры, немцы тоже подтасовывали цифры… Хотя особенно этим грешили партизаны: взорвали, пустили под откос... Хотя документ есть документ. На него ссылаемся. Если найдете более правдивый – Бога ради.

15. – Как содержались гитлеровские военнопленные в Беларуси?

– Первое время, как только освободили республику, их много умирало от голода и болезней. А потом условия содержания стали лучше, потому что пленных стали использовать как рабочую силу. Я не раз встречался с бывшими военнопленными немцами, они рассказывали, что кормили у нас по-божески. И население еще помогало. Я написал об этом статью «Милосердие к павшему преступнику», где привожу воспоминания известного доктора, профессора Александра Николаевича Мацко, как однажды в их деревню пришел сдаваться немец – оборванный, голодный молодой парень… И пока мужики ходили в сельсовет за начальством, женщины накормили его молоком с оладками. Таков наш менталитет. Хотя, казалось бы, сколько они пожгли, поубивали…

16. – В Минске до сих пор есть дома, которые построили пленные немцы. А еще на каких объектах они работали?

– На строительстве автомобильного завода. Там вся рабочая сила была – я смотрел списки – пленные немцы. А также наши осужденные граждане. Немцев формировали в специальные рабочие батальоны. Также в Беларусь из Германии после войны были принудительно этапированы немецкие граждане – работоспособные мужчины и женщины, которые не служили в армии при Гитлере.

– Никогда об этом не слышала!

– А об этом никто, кроме меня, и не писал. Многие из этапированных были инженерами. Они работали на строительстве тракторного и автозавода, жили на полувольном положении. И даже их семьи потом сюда приезжали. Обычно у нас принята такая формулировка: героизм советского народа после войны позволил в кратчайшие сроки восстановить народное хозяйство. Но как было в действительности? Страна понесла огромные потери трудоспособного населения – и мужчин, и женщин. Да и в 1946-м еще шла война с Японией, то есть не все были даже демобилизованы с фронта. Кто здесь мог работать? Бабки, дедки и несовершеннолетние. И поэтому в 1946-м году было принято постановление о привлечении военнопленных к строительно-восстановительным работам. Пленные были распределены по категориям трудоспособности по всем предприятиям республики, по всей территории СССР.

17. – И ведь хорошо строили, хорошо работали, правда?

– Где бы ни был – в Беларуси, России – немецкие дома выделяются до сих пор. Пленные восстанавливали, к слову, и наш Большой театр. Когда работы были закончены, их отряд даже привели на спектакль – сдачу перед премьерой. Я лично встречался с одним из бывших военнопленных, который побывал на том «Лебедином озере» и написал воспоминания. Кстати, он работал в похоронной команде.

18. – То есть, если пленные болели, умирали, их хоронили в Минске? Но разве есть у нас такие кладбища?

– В самом Минске не сохранилось ни одного захоронения. Когда-то было большое захоронение в Масюковщине. Но город стал расширяться, поэтому сделали эксгумацию, перезахоронили где-то 1098 останков военнопленных на гражданском кладбище в Тарасово. Там стоят памятники и кресты. Я знаю очень много подобных мест в Беларуси, да и в Минске тоже. Но сейчас они ничем не обозначены, и со временем может получиться такая ситуация, что останки откопают случайные люди и будут говорить, что нашли захоронение жертв сталинских репрессий. Но в архивах информация о захоронениях есть. Все в точности.

19. – Когда началась репатриация военнопленных?

– В 1947-м, а где-то и раньше. В первую очередь отправили инвалидов, нетрудоспособных. Держать их на балансе стране было невыгодно. Потом стали отправлять ударников – тех, кто хорошо работал. Последних – тех, кто отбывал наказание на территории России. Это уже 1955-й год.

20. – В русской императорской армии плен не считался преступлением, общество относилось к пленным как к страдальцам. А вы, как исследователь, как относитесь к пленным?

– Сострадательно. Но во время войны и после советские военные, побывавшие в плену, и те, кто был угнан на работу в Германию, как известно, осуждались, иногда жестоко наказывались. Считалось, что человек просто обязан был умереть.

21. – А вот как к вашим исследованиям о военнопленных на нашей земле относятся коллеги-историки?

– Времени прошло достаточно, так что теперь – с пониманием. Но раньше, конечно, эта тема была нулевая, в Советском Союзе об этом нигде не писалось. Я случайно наткнулся на кое-какую информацию, листая совершенно другие документы в архиве. Но директор архива приказала забыть обо всем, документы были засекречены примерно до начала перестройки. Но я уже знал о них и готовился внутренне к изучению. Тем более что моя жена, когда я ей рассказал, что видел в архиве, первая меня подтолкнула: «Это твоя будущая докторская диссертация!» И как в воду глядела. В книге «Архипелаг ГУПВИ на территории Беларуси» я ей даже слова благодарности написал в предисловии.

22. – Жена – историк? Педагог?

– Нет. Она – поэтесса.

23. – Но когда время пришло, вам быстро утвердили тему? Не было психологического сопротивления?

– Конечно, один старый генерал в Академии МВД, где проходило обсуждение, был категорически против. Немцы – враги, и точка! Никому не надо в эту тему лезть. Но большая часть все-таки меня поддержала. Чтобы не перевирали информацию, не использовали в своекорыстных интересах, лучше самим ее открыть и прокомментировать.

24. – Как вы думаете, почему время от времени вспыхивают споры о Великой Отечественной войне? Пересматривают то подвиг панфиловцев, то подвиг Матросова…

– Многие хотят умалить великий вклад, который внес советский народ в Победу. Но кто в этом виноват? Идеологический прессинг. Возьмем подвиг Матросова. Его имя почти канонизировали. Но первым такой подвиг совершил младший политрук Панкратов под Новгородом еще 24 августа 1941 года! А о нем мы почти ничего не знаем. И белорусов-героев было немало. Сын священника Новицкого, например. Отца, можно сказать, советская власть уничтожила, а сын не пощадил своей жизни за советскую Родину и тоже накрыл собой пулеметное гнездо. Но долгое время у него даже могилы не было, только после войны подростки случайно раскопали, нашли медальон, а военные восстановили имя героя. Я к чему? Мы в основном знаем со школы только десять-пятнадцать фамилий. Вот и получается казенщина в докладах из года в год.

25. – В идеале историк должен быть свободным от идеологии, от человеческих эмоций. Но на практике разве это возможно?

– Возможно. Прежде всего не надо факты искажать. Не надо ничего приукрашивать. Но и умалять достоинства не надо. Надо говорить правду.

Елена МОЛОЧКО.

ПРЭМ'ЕРА

У Мінску пакажуць скандальную стужку «Чарнобыльскія самураі»

Як лічыць беларускі біёлаг **Аляксей Несцярэнка,** аварыя на Чарнобыльскай АЭС стала ўскоснай прычынай смерці больш за мільён чалавек па ўсім свеце (у 1986–2004 гадах). А вось эстонскі лекар **Пеэтэр Мардна** (у 1986 годзе – галоўны радыёлаг Эстонскай ССР) лічыць, што празмернае выпраменьванне, якое атрымалі ліквідатары, – усяго толькі міф. Мардна доўгі час вывучаў здароўе эстонскіх ліквідатараў аварыі і сцвярджае, што галоўнай прычынай іх смерці была псіхалогія (яны сыходзілі ў іншы свет пасля суіцыду або ў выніку ўжывання алкаголю).

Несцярэнка і Мардна – галоўныя героі эстонскага фільма "Чарнобыльскія самураі", які прысвечаны ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтую стужку можна будзе ўбачыць 25 мая ў 21.00 у кінатэатры "Перамога" (вуліца Інтэрнацыянальная, 20). Паказ адбудзецца ў межах Фестывалю сучаснага еўрапейскага кіно. Усе квіткі – бясплатныя. Атрымаць іх можна будзе ў касе за гадзіну да пачатку фільма.

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ.

РОЗДУМ

Васіль ЯКАВЕНКА, пісьменнік

Пра свет, які з'ехаў з катушак

Як сцвярджаў нябожчык Мікола Крукоўскі, наш славуты беларускі філосаф, а за ім і іншыя валадары думкі, культура чалавечай цывілізацыі развіваецца па спіралі або сінусоідзе: спачатку станаўленне, затым – росквіт, потым упадак і – поўны распад цывілізацыі. Гэта пацвярджаецца гісторыяй цывілізацый, і апошні часавы перыяд, як правіла, супадае з перавагай асабістых інтарэсаў і, калі хочаце, "правоў чалавека" над грамадскімі і нацыянальнымі інтарэсамі і правамі. Асабліва гэтая тэндэнцыя выразна назіраецца ў Заходняй Еўропе. Прычым даходзіць да яўнага абсурду, калі культура адмаўляе саму сябе і робіцца заганнай.

Пяць-шэсць гадоў таму дзяржаўныя дзеячы Германіі, Францыі, Англіі сталі заўважаць: нешта нелаяльнае і неліберальнае творыцца ў іх уладаннях, асабліва з масавым прытокам іншаверцаў і наогул людзей іншых рас і што мультыкультурная палітыка ў Еўрасаюзе дае збоі. Іншаземцы не ўпісваюцца ў агульны малюнак карэннай нацыі, спараджаюць канфлікты і сацыяльнапсіхалагічную напружанасць. І тады ж заходнія ўладары даручылі былому міністру замежных спраў Германіі Ёшку Фішару стварыць кампетэнтную еўрапейскую камісію ды кардынальна вывучыць сітуацыю з "варагамі". Аднак у камісію Фішара не патрапілі сталыя вучоныя: ні філосафы альбо сацыёлагі, ні дэмографы альбо псіхолагі, ні культуролагі… Сабраліся там чыноўнікі сярэдняй рукі і самі сябе назвалі мудрацамі. Нядоўга думаючы, яны падмянілі вядомы класічны пастулат (закон) аб развіцці ад простага да складанага да відавой разнастайнасці. Закон распаўсюджваецца на ўсё жывое і існае, на грамадскія структуры таксама, у прыватнасці – на культуры народаў і самі нацыі... І закон падмянілі тэзісам аб мультыкультурнай разнастайнасці грамадзян у адной супольнасці ды ўхвалілі палітыку на стварэнне дэмаграфічнай кашы ў Еўропе. Маўляў, *«новыя хвалі іміграцыі будуць яшчэ больш памнажаць разнастайнасць»,* – гэтак дэкларавалі яны. І невуцтва ўзяло верх!

Цяпер, калі Заходнюю Еўропу запаланілі бежанцы і падзеі пачалі развівацца зусім не паводле еўрапейскіх стандартаў, усё часцей і часцей адбываюцца тэракты, незадачлівыя еўрапейскія лібералы схапіліся за галаву: даводзіцца расхлёбваць кашу, якую заварылі! Толькі Ёшка Фішар застаецца ўбаку. А тым часам самую буйную ідэалагічную дыверсію з падменай навуковых паняццяў і ўхваленнем мультыкультуралізму, ад якога Еўропа цяпер стогне, зрабіў менавіта ён.

Пра нацыі…

Пра нацыі чамусьці мала хто дбае. Пра іх і ў міжнародных арганізацыях нікому галава не баліць, ні ў ААН, ні ў ЕС, ні ў Еўразійскім саюзе… Дый у нашым затулку… таксама. А дарэмна, бо нацыя – гэта па форме і змесце, па сацыякультурнай адметнасці і духоўным напаўненні – самая вялікая каштоўнасць, створаная тым ці іншым народам, наогул чалавецтвам. Вядома, калі рушацца нацыі, знікае цывілізацыя.

У адрозненне ад некаторых вучоных і пісьменнікаў я прынцыпова лічу, што беларуская нацыя ўтварылася не ў ХХ стагоддзі, а нашмат раней за іншыя нацыі ў Еўропе, яна сфарміравалася яшчэ ў сярэднявеччы з ліцвінаў, продкаў беларусаў у Вялікім Княстве Літоўскім, бо там былі ўсе адметныя рысы нацыі – агульная тэрыторыя, мова, адзіны ўласцівы народу менталітэт і гістарычная памяць, адзіны гонар за сваю зямлю і культуру, які дакументальна зафіксаваны, асабліва ў вышэйшага пласта грамадства – у шляхты. Прычым базавай, фундаментальнай культурай тады была побытавая і духоўная культура вёскі, яна перадавалася са стагоддзя ў стагоддзе і абагачалася, сведчаннем чаму сёння з'яўляюцца шматлікія тамы фальклору і помнікі беларускай пісьмовасці. У тым ліку і самы вялікі гістарычны дакумент дзяржавы і нацыі – Статут Вялікага Княства Літоўскага!

Зазначу, што пасля апошняй вайны з гітлераўцамі (на маёй памяці) беларусы ў пераважнай большасці гаварылі па-беларуску і ведалі розніцу паміж сабой і прадстаўнікамі іншых нацыянальных утварэнняў, у тым ліку палякамі і рускімі, што паказвае на нацыянальнае самаўсведамленне.

Значна пазней, у 1980-я гады, падчас вандроўкі па Беларусі разам з вядомым рускім публіцыстам і пісьменнікам Іванам Васільевым мне выпала прысутнічаць на ранішняй планёрцы ў адным з калгасаў Валожынскага раёна. Там усе спецыялісты і калгаснікі гаварылі на выдатнай, чыстай, каларытнай беларускай мове. Іх мовай я быў проста зачараваны. Я ганарыўся імі. А "мова – дом духоўнага быцця", паводле сцвярджэння Хайдэгера. Мова там жыла! І я мару з'ездзіць туды сёння.

Аднак, што да нацыі, яе развіццё на беларускіх землях было запаволена і затарможана на цэлыя стагоддзі – з-за ўваходжання ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Ад поўнага апалячвання ўвесь наш народ выратавала вёска, у якой культура і дух насельнікаў былі як бы закансерваваны. Нашы сяляне ў масе сваёй не ўспрынялі ні пальшчызны, ні расейшчыны, і такая сітуацыя захавалася аж па ХХ стагоддзе, можна сказаць, па ліхія 1930–1940-я гады, пакуль сталінскія найміты не пачалі высякаць творчую і тэхнічную інтэлігенцыю, гарадскую і сельскую, вучоных, найбольш адораных і здольных сялян. Толькі ж паламаныя расліны і дрэвы адраджаюцца, калі ёсць карані.

У наступныя векапомныя камуністычныя дні савецкім ідэолагам пры падтрымцы мясцовых манкуртаў удалося ўсё ж навязаць нам русіфікацыю і парушыць беларускі нацыянальны падмурак. Як сказаць, ці ёсць ён цяпер альбо яго няма?.. Спадзяванні, я чую, на моладзь. А яшчэ ў нас застаецца магутны акумулятар нацыі – гэта разгалінаваная беларуская літаратура, якая зрабіла свой выдатны ўнёсак у адраджэнне народа і нацыі ў пасляваенны час нашай гісторыі. І – ёсць, ёсць яшчэ мы, уласна, сваімі персонамі!

Пра курс у адкрытым плаванні

Мы згубілі цікавасць да перспектыўных сваіх дакументаў. І нам не выпадае ведаць: ідэолагі ў сваіх лекцыях і манускрыптах **не** аналізуюць і не разглядаюць развіццё дзяржавы як нацыі. А хада жыцця між тым не спыняецца, і наш карабель кудысьці плыве і плыве, пакуль без компаса. А калі ён на месцы круціцца?.. Ёсць рызыка, і не давядзі Праведны, каб нас зацягнула ў Бярмудскі трохвугольнік!

Ужо не першы год мы ў душы лашчым спадзеў на прасвятленне ў галаве стырнавых, рулявых... Нарэшце, даходзяць ведамкі, што там недзе наша трывога пачутая, і ў рубцы ўстанаўліваецца новы навігацыйны прыбор – раз-пораз робяцца спробы выправіць курс карабля. А як добра было б – уладу займець над сабою і не даваяць рацца стыхіі!

Ад рэдакцыі

Артыкул "Пра свет, які з'ехаў з катушак" вядомага пісьменніка, публіцыста і грамадскага дзеяча **Васіля Якавенкі** яшчэ раз засведчыў, якія глыбокія, балючыя і найвастрэйшыя праблемы нашага нацыянальнага жыцця хвалююць аўтара.

Васіль Цімафеевіч даўно вядомы ў краіне як абаронца роднай зямлі і прыроды, палымяны ахоўнік Палесся ад згубнага праекта суцэльнага асушэння забалочаных масіваў і ператварэння Прыпяці ў скразную канаву, а Беларусі – ад пагрозы, нечуванай кліматычнай катастрофы.

Тэма адданасці роднай зямлі, зберажэння і прымнажэння яе матэрыяльных і духоўных скарбаў магутна гучыць ва ўсіх яго мастацкіх і публіцыстычных творах. А гістарычны раман "Надлом" (2003 г.), на аснове якога створана эпічная трылогія "Пакутны век" (2006 г.) высока ацэнена грамадскасць сталася каштоўным унёскам у скарбонку нацыянальнай культуры.

У працы над новым раманам "Тарнада на сонцы" Васіль Цімафеевіч Якавенка сустрэў на пачатку мая сваё 80-годдзе. Шчыра віншуем яго з гэтай адметнай датай, зычым добрага здароўя і невычэрпнай творчай энергіі яшчэ на шмат гадоў наперадзе!

У гонар юбілею пісьменніка Нацыянальная бібліятэка Беларусі (Мінск, пр.Незалежнасці, 116, галерэя "Лабірынт, 3-ці паверх") запрашае на прысвечаны Васілю Якавенку літаратурны вечар, які адбудзецца 25 мая.

Пачатак а 16-й гадзіне.

ПРЫСУД

Абышліся штрафамі

Кіраўнікі Свабоднага прафсаюза на ААТ «Полацк-Шкловалакно» Віктар Стукаў і Мікалай Шарах атрымалі штрафы.

Як раней паведамляла «Народная Воля», 28 красавіка Мікалай Шарах правёў пікет у Полацку супраць свайго звальнення з прадпрыемства, на якім адпрацаваў больш за 30 гадоў. Афіцыйная прычына – заканчэнне працоўнага кантракта, але, на думку актывіста, віной усяму яго прафсаюзная дзейнасць. Падтрымаць Мікалая Шараха прыйшло некалькі чалавек. Пасля правядзення вулічнай акцыі полацкі актывіст быў затрыманы ў пад'ездзе ўласнага дома.

Суд над актывістамі прайшоў учора ў Полацку.

– *За "правядзенне несанкцыянаванага мерапрыемства і непадпарадкаванне законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі" я атрымаў 30 базавых адзінак,* – пракаментаваў «Народнай Волі» рашэнне суда Мікалай Шарах. – *Віктар Стукаў – 25 адзінак. Адным словам, усё было прадказальна...*

Паводле слоў актывіста з Полацка, кіраўніцтва ААТ «Шкловалакно» не змяніла свайго рашэння і не працягнула працоўны кантракт. Мікалай Шарах мае намер звярнуцца ў суд у сувязі з незаконным звальненнем.

Раман ВАСЮКОВІЧ.

РУБАМ!

Хто вярбуе нашых дзяцей?

Кіраўнік кампаніі "Гавары праўду!" **Андрэй ДЗМІТРЫЕЎ** звярнуўся ў пракуратуру з просьбай правесці праверку і забараніць уезд у Беларусь грамадзянам замежных краін, якія спрычыніліся да набору беларускіх дзяцей у ваенізаваныя дзіцячыя лагеры на тэрыторыі іншых краін. Падставай для звароту сталі публікацыі ў беларускіх СМІ пра тое, што непаўналетніх беларускіх хлопчыкаў накіроўвалі ў ваенізаваныя трэніровачныя лагеры ў Расію праз **Віцебскую епархію**. Заняткі праводзілі расійскія неанацысты, якія маюць досвед баявых дзеянняў у складзе незаконных узброеных фарміраванняў самаабвешчаных ДНР і ЛНР.

Палітык указаў у сваёй заяве: "*Нам добра вядома, да якіх трагічных наступстваў прывяла дзейнасць гэтых баевікоў на ўсходзе Украіны. Няма ніякіх сумневаў, што «выкладчыкі» і «трэнеры» згаданых у паведамленнях СМІ лагераў вучылі беларускіх дзяцей экстрэмізму, неанацызму, здрадзе нашай Радзіме – Беларусі, нецярпімасці да людзей, якія не падзяляюць іх погляды аб адраджэнні «вялікай імперыі».*

Расцэньваю такую дзейнасць арганізатараў, пасрэднікаў, палітычных і фінансавых спонсараў падобных лагераў як сур'ёзную пагрозу для маральнага стану беларускіх дзяцей. Лічу дзейнасць рэлігійных і грамадскіх арганізацый, якія займаюцца вярбоўкай дзяцей для ўдзелу ў падобных лагерах, несумяшчальнай з заяўленымі імі статутнымі мэтамі".

Цяпер пракуратура мусіць задаць пэўныя пытанні прадстаўнікам духавенства з Віцебскай епархіі і даць прававую ацэнку іх дзеянням.

Любоў ЛУНЁВА.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
17 МАЯ 2016 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Не шкадуючы сродкаў, наплявалі на продкаў

У Кобрыне з мясцовага бюджэту выдаткавана 2,5 мільярда рублёў на рэканструкцыю музея А.Суворава.

Расії імперскае нораў
Ўводомы краінам Еўропы:
Яшчэ палкаводзец Суворaў
Драпежныя ладзіў захопы.
То шкоўдаваўся пад Ізмаілам,
То ў Альпы занесла чамусьці…
І толькі ўжо стаўшы пахілым,
Скаваў у сваім захапусці.
Шануюць ваяку без меры
Расійскія ўра-патрыёты:
І помнікаў там да халеры,
І годы кладуцца на ноты.
А хто, запытаемся ўсё-ткі,
Для нас, беларусаў, Суворaў?
Адказваюць нашыя продкі:

Не ідал, а злыдзень і вораг.
Суворaў душыў, як цалены,
Паўстанцаў з Гародні і з Брэста,
Дык злаць нам патрэбна [illegible]
Павагі-пашаны заместа.
А мы, не шкадуючы сродкаў,
Мацуем музей той пахілы,
Пляём, зневажаючы продкаў,
На іхнія ўжо магілы…

* * *

Прадбачу: з ухмылкай на твары
Дарадзіцьме хтосьці заўзята:
"Ці ж з-та не ваш, што ахвяры
За здзекі ўшаноўваць хата?"

Дзе дзяды ўзялі даляры на «ролс-ройсы», «ягуары»?

Падатковая інспекцыя выявіла больш за сто састарэлых мінчукоў, на якіх былі аформлены элітныя аўтамабілі: "Бэнтлі", "Ягуар", "Майбах", "Ферары", "Ролс-Ройс", "Порш", "Ламбарджыні" і іншыя.

[illegible]

Пачуў Іван (і ўсе пачулі):
– Я маю лепшае аўто!
Сабе купіла "Ламбарджыні" –

Вялі пра "Бэнтлі" перапалку
Яны, бабулі і "дзяды",
Хоць ведалі: на катафалку
Іх павязуць у нікуды…

АД РЭДАКЦЫІ

Алеся Няўвеся "Цырк на дроце" можна купіць у мінскай кнігарні "ЛогвінаЎ" (пр-т. Незалежнасці, 37а).

МУДРЫЕ МЫСЛИ

"Настоящий патриот – это человек, который болеет за свою страну и, когда видит, что что-то не так, пытается это исправить, пытается объяснить, как надо исправить. Когда власть совершает ошибку за ошибкой, втягивает страну в воронку национальной трагедии, в этой ситуации критика власти, пусть даже наказуемая властью, является по-настоящему мужественным проявлением своей любви к Отечеству".

Андрей ЗУБОВ, доктор исторических наук, профессор (Россия).

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Ты мяне пакахай

Ты мяне пакахай
За блакітныя вочы,
Ты мяне пакахай
За льняную касу.
І я буду спяваць
Аж да самай паўночы,
І я радасць сваю
Да цябе прынясу.
Ты мяне пакахай,
Родны мой, за усмешку,
Ты мяне пакахай
За душэўнасць маю.
Пракладу да цябе
Я душэўную сцежку,
І пакіну на ёй
Я чароўнасць сваю.
Ты мяне пакахай
За маю працавітасць,
Ты мяне пакахай,
Пакахай, родны мой.
Ты мяне пакахай
За спагаду, адкрытасць,
І ты будзеш шчаслівы,
Шчаслівы са мной.

Мікола СТАРЧАНКА.
Гомель.

НАРОДНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Разам адродзім Беларускую школу!

У гонар 100-годдзя беларускай школы, адчыненай у Вільні ў 1915 годзе, з якой распачалося стварэнне шырокай сеткі беларускіх школ у нашым краі

Да 400-годдзя выдання беларускага Буквара ў Віленскім Святадухавым брацтве ў 1618 годзе, надрукаванага ў друкарні мястэчка Еўе на Віленшчыне

Да 500-годдзя заснавання беларускага кнігадрукавання Францішкам Скарынам у 1517 годзе

Трэба разумець: цяперашняя дзяржаўнасць – народ падданы [illegible], бездакорны і часовы, іх не хвалюе лёс беларускай школы. Таму галоўны цяжар па вырашэнні праблемы павінна ўзяць на сябе грамадскасць краіны. Узяць з глыбокім разуменнем і болем у сэрцы за будучыню Беларусі. Бо стварэнне Беларускай школы – гэта і ёсць выбудова будучыні, а актыўная грамадскасць краіны – гэта і ёсць сам народ. У рэшце рэшт краіна – наша, і праблемы – не [illegible]. Менавіта нам іх і вырашаць!

Буквар

Галоўнай зарукай паступовага адраджэння беларускай школы, якасці навучання і пашырэння беларускамоўнага школьніцтва ў Беларусі будуць добрыя і цікавыя падручнікі, асабліва для першага класа. У рэчышчы нашай тэмы выявіліся праблемы з букварам. А той, па якім дзеткі вучацца сёння, наўрад ці лепшы варыянт.

Буквар – не проста першы ў жыцці падручнік. Ён павінен быць такой яркай, значнай, універсальна пазнавальнай першай кнігай, якая застанецца ў памяці надоўга. Зараз мы маем "Буквар" класіка гэтага жанру Анатоля Клышкі, які вытрымаў 40 выданняў, атрымаў міжнародныя ўзнагароды на выставах у краіне і за мяжой. Аднак з сённяшняга гледзішча гэта ўжо ўчорашні дзень буквара. Па-ранейшаму тут шмат калек з расійскай мовы, прыкладам: *рама, шалаш, верталёт, жмуркі* і г.д. Уражваюць даволі нязграбныя тлумачэнні літар…

Адкрываецца "Буквар" старонкай з выявай Ф.Скарыны. Гэта выдатна і правільна! Але Скарына чамусьці зусім не падобны да ўсім вядомага нам вобраза і пастаўлены на асноведзі нейкага французскага ці неагатычнага замка! Далей спатыкаешся, калі аўтар кажа: "Наваградак – першая сталіца магутнай старажытнай дзяржавы…" А якой дзяржавы, як яна звалася? Тут жа дадзена выява руін Наваградскага замка і – "Так нараджалася Беларусь…". Зноў жа – як "так"? На руінах Наваградскага замка ці што? Такое, лічу, недапушчальна.

Зразумела, выяўленчыя хібы "Буквара" А.Клышкі – на сумленні не столькі мастакоў, колькі мастацкіх рэдактараў ды аўтара і мастацкага савета Нацыянальнага інстытута адукацыі. Зразумела, першакласнікі павінны ведаць выявы нашых славутых асветнікаў Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага і іншых, як і Сафійскага сабора, Наваградскага замка, [illegible] Буквар і паставілі яго ў шэраг найлепшых у свеце. Грамадства мае права ведаць выдатны буквар, якім будзе ганарыцца кожны беларус і сёння, і праз 100 гадоў (так, як мы ганарымся "Букваром", выдадзеным у Вільні 398 гадоў таму). Гэта будзе Буквар незалежнай дзяржавы Беларусь, які стане падмуркам адраджэння беларускай школы.

Грамадскасць у асобе створанага Нацыянальнага грамадскага аргкамітэта па адраджэнні нашай школы возьме на сябе практычныя і арганізацыйныя працэдуры па стварэнні будучага буквара. Ён, як бачыцца, павінен быць беларускім і па змесце, і па выяўленні багацця нашай мовы, лексікі, народных традыцый. [illegible]

[illegible] удзел пісьменнік і мастак Адам Глобус. Ён абяцаў скласці свой буквар. Будзем спадзявацца, што ў нас ёсць ужо два будучыя аўтары новага буквара (першы, канечне ж, Анатоль Клышка), у іх шырокі прастор для працы…

І гісторыя, і сучаснасць

Адраджэнне беларускай школы неадрыўна ад адраджэння нацыянальнай гісторыі і культуры, а таксама выкладання геаграфіі і матэматычных прадметаў па-беларуску. У бліжэйшы час мы павінны таксама скласці падручнік па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі і ўключыць выкладанне гэтага прадмета ў школьную праграму як важны складнік эстэтычнага і культуралагічнага цыкла нароўні з беларускай літаратурай. Усё гэта павінна заняць трывалае месца ў школьнай праграме.

У навучанні геаграфіі Беларусі і свету ў беларускіх школах дагэтуль выкарыстоўваецца глобус расійскай вытворчасці. Сустракаюцца глобусы, вырабленыя ў Польшчы па-польску і ў Кітаі – на рускай мове з масай памылак. Ніхто за 25 гадоў існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь не паруліўся, каб стварыць у Беларусі вытворчасць глобусаў. Але яны павінны ўрэшце ў беларускіх школьнікаў з'явіцца.

Аргкамітэт будзе стымуляваць і стварэнне беларускіх цацак, беларускіх лялек у нацыянальных строях, казачных герояў з мультфільмаў, песнямі і беларускай музыкай, калыханкамі. [illegible]

(Цяпер жа ўлада праз тэлебачанне на нашы падаткі русіфікуе ўсё насельніцтва.)

У Беларусі дагэтуль няма ніводнага цалкам беларускамоўнага тэлеканала. А яны ж у пэўнай форме існавалі яшчэ ў савецкую пару, ды былі знішчаны. Між тым ва Украіне існуюць блізу 20 нацыянальных тэлеканалаў; у Літве, амаль утрая меншай па тэрыторыі за Беларусь, – каля 10. Нам патрэбна напачатку хаця б 3–4 беларускамоўныя тэлеканалы. Яны павінны быць аплачаны з дзяржбюджэту за кошт нашых падаткаў. На кожным канале – дзіцячыя перадачы, навукова-пазнавальныя і навучальныя праграмы для моладзі.

Працягам адраджэння беларускай школы павінен стаць Беларускі нацыянальны ўніверсітэт, аб якім даўно мараць многія беларусы. Абітурыентаў для яго пачнём рыхтаваць, не губляючы часу.

Таму да ведама бацькоў: спісы першакласнікаў, якія пойдуць у першы беларускі клас 1 верасня 2016 года, складаюцца ўжо цяпер, у маі.

Без мовы няма краіны

Натуральна паўстае пытанне: сённяшняя беларуская дзяржава ўжо адзначыла 100-годдзе беларускай школы? Скажыце, калі хто ведае: вы маглі гэта пачуць па радыё, убачыць па тэлебачанні? Не тут то было! Нам трэба самім брацца па праўцы, адказную і [illegible]. [illegible]

[illegible] разам з цывілізаваным светам мы будзем адзначаць 500-годдзе заснавання беларускага кнігадрукавання Францішкам Скарынам.

Мы ведаем, што на нашых тэрыторыях і 100 гадоў, і 400, і 500, і 800 гадоў таму адбываліся вялікія гістарычныя працэсы. Высокая духоўнасць і культура той пары самым грунтоўным чынам паўплывалі на далейшае развіццё нашай нацыі, на свядомасць і здольнасць выжываць у самых экстрэмальных умовах. І гэта для нас запавет продкаў, каб мы не далі змарнаваць нашу духоўную і культурную спадчыну. Дык возьмем жа ашчадна і з любоўю гэты скарб у наш сённяшні працоўны дзень і штодзённае карыстанне дзеля набліжэння годнай будучыні.

Усяму беларускаму народу жадаю мудрасці, рахманасці, рашучасці ў стварэнні сваёй школы!

За выкананнем нашых канстытуцыйных правоў будуць назіраць ЮНІСЕФ, ЮНЕСКА, АБСЕ.

З Богам у шчаслівую дарогу!

Мікола КУПАВА, сябра Беларускага саюза мастакоў, сябра ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", сябра ГА "Таварыства беларускай школы".

E-mail: dubrouna@gmail.com

БОЛЬ

…І выключылі як «нацдэмаў»…

У нумары "Народнай Волі" за 26 красавіка прачытаў артыкул пра беларускамоўнага доктара Андрэя Вітушку. Гэта, мабыць, першы выпадак абароны дысертацыі на навуковую ступень кандыдата медыцынскіх навук на беларускай мове. Дзякуй Андрэю за смелы ўчынак, за нацыянальную годнасць грамадзяніна Беларусі.

Гэты артыкул мяне натхніў на ўспаміны пра падзеі 50-х гадоў мінулага веку, калі з брыгадай БДУ я ўдзельнічаў ва ўборцы ўраджаю на цалінных землях. У студэнтаў, моладзі быў такі патрыятычны настрой, самаадданасць у працы, што ніхто не звяртаў увагі на працягласць працоўнага дня. Брыгада ў нас падабралася вельмі дружная і вясёлая, і ўсе размаўлялі на беларускай мове. А прозвішчы студэнтаў аказаліся як на падбор, выразна казалі пра нашу лясную старану: Сасноўскі, Заяц, Ваўкавец, Лісоўскі, Альшэўскі…

Неяк, ужо праз гады, сустракаю крыху маладзейшага за мяне Пецю Ваўкаўца. Пытаюся, як жыве, чым займаецца пасля заканчэння ўніверсітэта. "Ат, Толя, – адказвае ён, – ці ведаеш, што здарылася? Нашых хлопцаў, што размаўлялі па-беларуску, абвінавацілі ў "нацдэмаўшчыне" і ўсю нашу "лясную" каманду выключылі з БДУ як "нацыяналістаў"… Цяпер вось працую на лесапілцы. Астатнія ўладкаваліся дзе хто мог".

Дарагія мае нацыяналісты! Адгукніцеся, калі ласка, праз "Народную Волю"! Можа, раскажаце падрабязней, як усё тады здарылася і хто прымаў рашэнне аб выключэнні вас з БДУ?

З павагай
Анатоль ГІЛЕВІЧ.
Мінск.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!



Чаму ў нас такія дзіўныя законы?

Добры дзень, паважаная рэдакцыя "Народнай Волі"!

Прыміце шчырую ўдзячнасць пастаяннага чытача газеты за насычанасць газеты разнастайнымі матэрыяламі, за чэснасць пазіцыі аўтараў. На старонках газеты часта можна знайсці тэксты пра самыя хвалюючыя жыццёвыя пытанні. Вырашыў звярнуцца да вас і я. Можа, з дапамогай газеты я знайду адказ на пытанне, якое, магчыма, хвалюе многіх інвалідаў.

"Народная Воля" апошнім часам многа піша пра пенсіі. Выказваецца шмат меркаванняў. Людзі трапляюць у розныя жыццёвыя сітуацыі.

Мне 56 гадоў, з'яўляюся інвалідам II групы з дзяцінства, працоўны стаж складае 36 гадоў (з іх 32 гады – педагагічны стаж). Як мне павінна налічвацца пенсія па ўзросце? Уцямнага адказу на гэта, здавалася б, простае пытанне я атрымаць не магу. Гавораць, што ў нас гуманная дзяржава, якая клапоціцца аб інвалідах; за 25 год стажу ім налічваецца 65% замест 55%, а інваліды з дзяцінства дык і наогул маюць шмат ільгот.

Больш дэталёва апішу сваю сітуацыю. Да 19-гадовага ўзросту я атрымліваў пенсію па II групе інваліднасці з дзяцінства ў памеры 16 рублёў. У 19 год я ад пенсіі адмовіўся, вырашыўшы па маладосці, што закончу інстытут і добрасумленна зараблю сабе пенсію. Зноў II групу інваліднасці з дзяцінства я пажыццёва ўзнавіў ва ўзросце амаль 52 гадоў. З дазволу МРЭК я працягваў працаваць на стаўку. І зараз працаваў бы, калі б не закрылі школу. Паколькі ў мяне вялікі стаж і вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя, то работу па спецыяльнасці мне прапаноўвалі. Але ж у 55 гадоў мяняць месца працы мне не захацелася, да таго ж выпадкова даведаўся, што маю права на пенсію па ўзросце. Налічылі мне пенсію, зыходзячы з наступнага разліку:

за 25 гадоў працоўнага стажу – 65%;

за 36-ы год стажу – прыблізна 400.000 руб.;

як інваліду з дзяцінства – надбаўка ў вызначаным законам памеры.

А вось за 10 гадоў стажу я не маю нічога. "А што было б, калі б я, адпрацаваўшы 25 гадоў, біў лынды, сядзеў на шыі ў дзяржавы?" – са здзіўленнем спытаў я ў работнікаў райсабеса. На што мне адказалі: "Вы атрымлівалі б пенсію ў тым жа памеры за вылікам 400.000 рублёў, зробленых вамі за 36-ы год стажу, такія ў нас законы". Нічога сабе законы! 10 гадоў (не 10 дзён!) я працаваў, думаючы, што зарабляю сабе пенсію, паляпшаю сваё жыццё на старасці. Можна было б зразумець, калі б гэтыя гады мне ўлічылі пасля дасягнення мною пенсіённага ўзросту – цяпер 63 гадоў. Але ж мне сказалі, што мая пенсія пералічвацца ўжо не будзе. А можа, і сапраўды ў нас такія дзіўныя законы?

З павагай і найлепшымі пажаданнямі пастаянны чытач з першага нумара –

Мікалай Мікалаевіч ПРАНЮК.
г.Драгічын.

РЭЗАНАНС

Спадзяванні толькі на свядомую моладзь



З цікавасцю прачытаў інтэрв'ю **Марыны Коктыш з Аляксандрам Ярашуком *"Социальные взрывы организуют не бедные и нищие, а люди с достатком"***. І вось на якія думкі яно мяне навяло. Часта ў артыкулах газеты чытаю парады розных чытачоў: *"трэба рабіць так…"*. Калі аўтары гэтых парад вучаць цяперашнюю ўладу, як ёй трэба рабіць, дык гэта марная справа. Сённяшняя ўлада дрэнна вучыцца на сваіх памылках, яна не схільная да самаразвіцця, як і сістэма, якую яна стварыла. Калі ж аўтары гэтых парад кажуць, нібыта самі яны знаходзяцца ва ўладзе, тады ўзнікае пытанне: як яны збіраюцца ўзяць гэту ўладу? Ставім калёсы паперадзе каня…

А.Ярашук кажа: *"А духовная нищета у властей предержащих неизбежно трансформируется в физическую нищету граждан, тех, кому выпало несчастье жить с такими руководителями»*. Дык вось, беларусам не "выпало несчасце", яно не само звалілася на іх. Наш народ сам выбраў гэта "няшчасце" ў 1994 г. на першых выбарах прэзідэнта. Не трэба А.Ярашуку шкадаваць народ за "няшчасце". "Кожны народ варты свайго правіцеля", якога ён абраў. Мне адзін мужчына казаў: "Я ж галасаваў за Лукашэнку, думаў, ён на два тэрміны". Ага, індык думаў…

Наш народ прагаласаваў не за нацыяналіста З.Пазьняка, які на пасадзе прэзідэнта не абдымаўся б з расійскімі каланізатарамі, а пры ўмове, я ўпэўнены, дэмакратычнага кіравання з яго боку ЗША дапамаглі б Беларусі, як гэта абяцаў Б.Клінтан, знаходзячыся ў Беларусі ў 1994 годзе. За 3–5 гадоў такой падтрымкі з боку ЗША беларусы, якія гістарычна добра працуюць, а цяпер толькі добра выконваюць загады начальства, самі зрабілі б сваё жыццё больш шчаслівым. Але ж тады не захацелі… Пры Пазьняку Беларусь набывала б энерганосьбіты не толькі ў Расіі, а і з Чарнаморска-Балтыйскага калектара, ідэя стварэння якога належала Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце. Беларусь эканамічна і палітычна была б незалежнай ад Расіі, і цяпер бы не прыйшлося змагацца за гэту незалежнасць.

Ярашук слушна кажа пра мадэрнізацыю, якую трэба праводзіць у Беларусі. Беларусь у гэтым сэнсе моцна адстала ад Еўропы.

Прыход да ўлады свядомых беларусаў, якія праводзілі б больш-менш самастойную палітыку, незалежную ад Крамля, будзе доўгім і цяжкім. Ужо гаварылася, што разруха ў краіне – гэта вынік "разрухі" ў галовах людзей. Значыць, апазіцыі гэтыя два дзесяцігоддзі трэба было змагацца не супраць улады, а супраць "разрухі" ў галовах людзей.

Як казаў Ніл Гілевіч, "нацыя пачынаецца з роднай мовы". У Беларусі не будзе сацыяльнага выбуху, "людзі на балоце" да яго не здольныя. Спадзяванні мае, якія меў і Н.Гілевіч, толькі на свядомую моладзь – новую генерацыю беларусаў, якія не хочуць жыць "на балоце". Гэтая моладзь не будзе прасіць лепшага жыцця ў прэзідэнта, яна гэта жыццё будзе ствараць сама!

Алесь РАШЧЫНСКІ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
17 МАЯ 2016 г.

ПИСЬМА С КРЕЩАТИКА

Александр ФЕДУТА

Прокурор в полосатой робе

Блестящая победа Джамалы в конкурсе «Евровидение» заслонила то, что на самом деле было главным событием в жизни Украины на прошедшей неделе. Страна получила нового генерального прокурора. И это вызвало бурю – не только в Верховной Раде, но и в обществе.

12 мая 2016 года главным контролером законности в Украине стал бывший политический заключенный **Юрий Витальевич Луценко.** Человек, на собственной судьбе испытавший влияние старой коррумпированной правоохранительной системы.

Последний генеральный прокурор эпохи Виктора Януковича Виктор Пшонка бежал из страны сразу после падения режима. Кадры, когда Пшонка и министр налогов и сборов Александр Клименко прорываются в Донецком аэропорту с оружием к вывозившему их частному самолету, стали хитом интернета.

Пшонке было чего бояться. Во-первых, дом, который не смог увезти с собой в Россию этот почтенный юрист, был набит таким количеством ювелирных ценностей и антиквариата, что никакой поданной им легально декларацией не описать. Во-вторых, в ходе досмотров были обнаружены документы, свидетельствующие о том, что именно Пшонка был ключевой фигурой при силовом разгоне Майдана.

Последовавшие за ним «политические» генпрокуроры, однако, не оправдали надежд украинцев. Олег Махницкий, Виталий Ярема, вынесенные наверх волной «Революции Достоинства», так и не смогли внушить доверие к институту прокуратуры. Не справился с этой задачей и выходец из старой прокуратуры Виктор Шокин, предложенный президентом Петром Порошенко: уже очень скоро его отставка стала одним из главных требований сохранения «европейской коалиции» в Верховной Раде. Правительственный кризис смогли разрешить во многом благодаря тому, что президент удовлетворил требование партии Арсения Яценюка «Народный Фронт» и уволил Шокина.

Уволить просто. Найти замену труднее.

Юрий Луценко не один день пребывает в высшем эшелоне украинской политики. По советским меркам он происходит из «хорошей» номенклатурной семьи: отец, Виталий Иванович, был первым секретарем Ровненского обкома КПСС, затем – народным депутатом Украины от КП УССР и секретарем ЦК КПУ. Сам Юрий десять лет (1996—2006) был одним из лидеров Социалистической партии Украины, в демократическом правительстве – после «оранжевого Майдана» – дважды занимал пост министра внутренних дел.

В должности министра Луценко был одним из символов украинской демократии – примерно таким же, как и Юлия Тимошенко. Неслучайно расправа над ним стала одной из главных уголовно-политических акций, совершенных при Викторе Януковиче: по обвинению якобы в превышении служебных полномочий и нецелевом расходовании средств он был осужден в 2012 году на четыре года лишения свободы с конфискацией имущества. Как пели остряки из Театра КВН Днепропетровского университета, «главное – чтобы Луценко сидел».

Его посадили. Международные организации признали этот приговор, как и приговор Тимошенко, политически мотивированным, а освобождение Луценко было одним из главных требований накануне предполагавшегося подписания Договора об ассоциации «Украина – Европейский Союз». 7 апреля 2013 года президент Янукович помиловал осужденного Луценко. Юрия Витальевича освободили. В новом составе Верховной Рады, избранной уже в 2014 году, Луценко возглавил фракцию «Блока Петра Порошенко», однако, несмотря на всю свою лояльность к президенту, продолжал восприниматься как достаточно самостоятельная фигура.

Может быть, именно поэтому никого не удивило, что именно его Порошенко предложил в качестве нового генерального прокурора страны. Лояльность – и относительная самостоятельность, опыт работы в правоохранительных органах – и одновременно опыт политзаключенного.

Однако старое законодательство о прокуратуре писалось «не под Луценко». Пост генерального прокурора не мог, согласно закону, занимать человек, не имевший юридического образования и опыта работы в данном ведомстве. Поэтому первым шагом к назначению Луценко стало «проламывание» поправок в закон о прокуратуре в Верховной Раде. Здесь на пути к намеченной цели встали бывшие соратники по борьбе. Луценко был даже вынужден публично возражать Юлии Тимошенко, которая требовала сохранить норму о специальном образовании:

– Юлия Владимировна, нас с вами сажали не просто юристы, а доктора юридических наук!

Это правда. Виктор Пшонка, запечатленный на картинах, хранившихся в его доме, в виде римского патриция, действительно был доктором наук. А судя по коллекции православных икон – еще и верующим.

Закон «под Луценко» был принят. Президент без проволочек подписал его и внес кандидатуру Юрия Витальевича на рассмотрение Верховной Рады.

И здесь скандальность ситуации еще более усугубилась. Кандидатура Луценко была принята голосами не только правящей коалиции («Блок Петра Порошенко» и «Народный Фронт» Арсения Яценюка), но и голосами бывших членов Партии Регионов из фракции «Відродження» и даже нескольких депутатов «Оппозиционного блока». То есть представителями тех политических сил, расправы над которыми требовали наиболее радикальные сторонники Майдана.

Поэтому многими революционерами первые же заявления Юрия Луценко в должности генерального прокурора были восприняты чуть ли не как предательство. Однако с точки зрения автора этих строк заявления эти свидетельствовали как раз о верности Луценко идеалам Майдана. Вкратце их можно сформулировать так: закон и справедливость – по отношению ко всем.

Удастся ли Юрию Луценко отстоять этот принцип – покажет время. Пока лишь можно сказать, что успех Луценко в должности генерального прокурора будет очень интересным прецедентом и для Украины, и для всех оппозиций на постсоветском пространстве. Если бывший политзэк, получивший в руки такой инструмент, как прокуратура, сможет удержаться от личной мести и отстоять принципы законности и справедливости, он становится очевидным примером действия будущих демократических правительств.

Киев.

СТОП-КАДР

Пілот Формулы-1 з каманды Mercedes Ніка Росберг скача ад радасці пасля перамогі на Гран-пры Расіі ў Сочы.
REUTERS/Maxim Shemetov.

СЛЫШАЛИ?

Латвию официально пригласили в «клуб богатых стран»

Организация экономического сотрудничества и развития (ОЭСР) направила Латвии официальное предложение стать 35-м членом организации.

«Мы будем рады видеть Латвию в качестве члена ОЭСР, – отметил генеральный секретарь организации **Анхель Гурриа.** – Такой шаг упрочит стремление организации объединить под своей эгидой страны, желающие обмениваться передовым опытом и решать самые важные глобальные экономические и социальные проблемы».

Латвия стала членом ЕС в 2004 году, а в начале 2014 года вступила в еврозону. Страна вела переговоры о вступлении в ОЭСР последние три года. Они завершились в апреле, когда Рига получила положительную оценку от всех комитетов организации. Соседняя Эстония стала членом ОЭСР в 2010 году.

По словам министра иностранных дел Латвии **Эдгарса Ринкевича,** вступление в ОЭСР было давним приоритетом Латвии. «Членство в организации самых развитых государств мира само по себе не является гарантом благополучия. Мы сами будем ответственны за то, чтобы полноценно использовать членство в ОЭСР», – подчеркнул он.

В 2015 году ВВП Латвии вырос на 2,7%. По оценке Еврокомиссии, в текущем году экономика страны вырастет на 2,8%, тогда как Центральный банк Латвии ожидает более умеренного роста – на 2,3%.

Основанная в 1961 году ОЭСР – одна из ведущих экономических организаций мира, нередко неформально называемая «клубом богатых стран», «финансовым НАТО».

Основным преимуществом ОЭСР считается наличие команды сильнейших экспертов, которая ежегодно публикует сотни аналитических исследований и вырабатывает рекомендации для стран-членов.

Важная часть работы ОЭСР – противодействие отмыванию денег, уклонению от уплаты налогов, коррупции и взяточничеству. Так, при участии организации были выработаны различные механизмы, призванные положить конец практике создания так называемых налоговых оазисов, и в ней официально запрещено членство государств, разрешающих офшоры на своей территории.

ОЭСР ежегодно составляет так называемый черный список, в который попадают государства, проводящие политику недобросовестной налоговой конкуренции. К государствам, отказывающимся от принятия международных налоговых стандартов, по инициативе организации могут быть применены экономические санкции.

В настоящее время в организацию входят Австралия, Австрия, Бельгия, Великобритания, Венгрия, Германия, Греция, Дания, Израиль, Ирландия, Исландия, Испания, Италия, Канада, Люксембург, Мексика, Нидерланды, Новая Зеландия, Норвегия, Польша, Португалия, Словакия, Словения, США, Турция, Финляндия, Франция, Чехия, Чили, Швейцария, Швеция, Эстония, Южная Корея и Япония.

Россия заявила о стремлении вступить в ОЭСР на саммите G8 в Галифаксе в 1995 году. В ноябре 2007 года совет ОЭСР принял «дорожную карту» вступления для Российской Федерации, в которой описаны условия присоединения страны к организации. Однако ОСЭР приостановила процедуру вступления в марте 2014 года из-за вовлеченности Москвы в события в Украине.

ФОТООКНО

Венгерских поваров назвали лучшими в мире

Шеф Томаш Сэль и его команда получили «Золотого Бокюза» – этот приз в мире высокой кухни приравнивают к «Оскару» или «Золотой пальмовой ветви» в киноиндустрии.

Более того, победа венграм досталась в родных стенах – финал 2016 года состоялся в Будапеште. «К этой победе мы готовились четыре с половиной месяца – и много-много лет», – говорит призер.

Кулинарная олимпиада среди профессиональных поваров «Золотой Бокюз» проводится с 1987 года, ее учредил один из самых знаменитых кулинаров Франции Поль Бокюз.

У СОСЕДЕЙ

На закрытие Игналинской атомной станции нужно еще 900 миллионов евро

На работы по демонтажу Игналинской АЭС, закрытие которой уже обходится в сотни миллионов евро, с 2020 года понадобится еще около 900 млн евро, говорит представитель станции, цитирует LETA/BNS. Вице-министр энергетики поведал, что переговоры с Еврокомиссией (ЕК) о дальнейшем финансировании закрытия ИАЭС начнутся в 2017–2018 годах.

«По предварительным подсчетам, может понадобиться около 900 млн евро (точнее 906,2 млн евро. – **Прим. BNS.**). *Переговоры еще не начались»,* – сказал в среду на совместном заседании парламентских Комитета по экономике и Комиссии по энергетике директор Департамента планирования деятельности и финансов ИАЭС **Аудрюс Каменас.**

«После 2020 года мы надеемся, что все ведомства Литвы будут прилагать усилия, направленные на продление и обеспечение финансирования из Евросоюза (ЕС), от доноров, чтобы мы могли продолжать работы по закрытию», – добавил Каменас.

По словам представителя ИАЭС, сейчас уже ведется лоббистская деятельность с целью обеспечить поддержку со стороны стран-доноров – проводятся встречи с послами Швеции, Франции, Германии, Испании.

По словам вице-министра энергетики **Рокаса Балюковаса,** активные переговоры о дополнительном финансовом вливании из ЕС в закрытие ИАЭС могли бы начаться в 2017–2018 годах.

По словам Каменаса, на сегодняшний день на закрытие станции уже потрачен 941 млн евро, а до 2020 года намечается освоить еще 745 млн евро из бюджетов ЕС и Литвы.

ИАЭС, которая первой в мире прекращает работу считающихся опасными российских реакторов типа РБМК, будет окончательно закрыта до 2038 года, а начатый в 2004 году процесс ее закрытия обойдется в 2,593 млрд евро. По словам А.Каменаса, эта сумма намечена в утвержденном в августе 2014 года генеральном плане прекращения деятельности станции.

Проекты по закрытию ИАЭС осуществляет консорциум, в который входят германская компания российского капитала Nukem и производитель контейнеров – германская GNS.

НУ И НУ!

Самый большой круизный лайнер в мире отправился в первое длительное плавание

Круизный лайнер Harmony of the seas класса Oasis покинул порт французского города Сен-Назер.

Судно взяло курс на порт Саутгемптон на южном побережье Великобритании, где возьмет на борт первых пассажиров. Потом корабль пойдет в Барселону, откуда начнется его первый круиз по Средиземному морю.

Водоизмещение Harmony of the seas составляет 227,5 тысячи тонн, его ширина 66 метров, длина 362 метра. Это на 20 метров больше, чем высота Эйфелевой башни. На его борту смогут разместиться 6,4 тысячи пассажиров и более 2 тысяч членов экипажа.

Строительство корабля заняло 2,5 года и обошлось судовладельцу – компании RCI – в миллиард евро.

ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА

Еўрапейскі супрацьракетны шчыт у Польшчы

Ужо некалькі гадоў ідзе працэс падрыхтоўкі да запуску элементаў дадзенай сістэмы. Днямі ў Польшчы пачаліся работы па стварэнні другога кампанента сістэмы. Першы кампанент – база супрацьпаветранай абароны Aegis, пабудавана ў Румыніі. Нядаўна там адбыўся ўрачысты запуск сістэмы. Гэта батарэя ракет «зямля–паветра» SM-3 у кантынентальнай версіі.

Польская база павінна быць гатова ў 2018 годзе. Гэта будзе істотны ўнёсак ў павелічэнне абароннай здольнасці Альянсу ад пагроз, у першую чаргу з тэрыторыі Блізкага Усходу, заявіў амерыканскі амбасадар у Польшчы Поль Джонс.

Апроч Польшчы і Румыніі ў натаўскі супрацьракетны шчыт уваходзяць база ў Іспаніі, дзе стаяць караблі сістэмы Aegis, узброеныя ракетамі SM-3 у марской версіі, камандны цэнтр у Нямеччыне, радары ў Турцыі ды Вялікабрытаніі, а таксама флатылія караблёў з новымі радарамі ў Даніі і Галандыі.

Паводле меркаванняў экспертаў, стварэнне сістэмы будзе крокам наперад у справе ўмацавання абароннай здольнасці NATO, гаворыцца ў артыкуле на сайце "Польскага радыё для замежжа" і прыводзяцца словы Вось што сказаў аналітык Цэнтра вывучэння еўрапейскай палітыкі Пітэра Доран: "На маю думку, у Польшчы на пастаяннай аснове павінны знаходзіцца амерыканскія вайскоўцы. Шмат гадоў таму ў нас была джэнтльменская дамоўленасць з расіянамі, што, калі стратэгічная раўнавага застанецца нязменнай, нам не давядзецца размяшчаць сілы NATO ў новых краінах-членах. Расійская агрэсія, захоп украінскіх тэрыторый усё змяніў. Тая дамоўленасць больш не дзейнічае. Некаторыя кажуць у нас, што гэта толькі справакуе расіян. Крэмль актыўна падтрымлівае такія перакананні. Аднак я лічу, што ў нас мала часу, каб пачаць ствараць базы ў Цэнтральнай Еўропе. Настаў час, каб NATO стала пасялілася ў рэгіёне".

ЛЮБОПЫТНО...

Загадочная и «впечатляюще быстрая» продажа яхты Лесина

Роскошная яхта, принадлежавшая бывшему министру печати России Михаилу Лесину, продана неназванному покупателю. Продажа 55-метрового судна, объявленная компанией IYC, размещающейся во Флориде, состоялась на фоне нераскрытых обстоятельств внезапной смерти Михаила Лесина, а также нерешенных вопросов в отношении его имущества и активов.

Фирма IYC объявила, что судно было продано 26 апреля, но не представила никаких подробностей относительно цены продажи, покупателя и продавца, который заключил сделку, отметив лишь, что это была «впечатляюще быстрая продажа».

Катя Джаймес, агент по продаже, отказалась предоставить корреспонденту Радио Свобода/Радио Свободная Европа дополнительные детали, за исключением того, что яхта была первоначально оценена в 40 миллионов долларов.

По сообщениям австралийской прессы, яхта находилась в Австралии на ремонте, когда Лесин был найден мертвым в отеле Dupont Circle в Вашингтоне 5 ноября. Яхта затем была доставлена через Тихий океан во Флориду и выставлена на продажу в Палм-Бич.

Лесин был основным игроком в российской телевизионной индустрии, его компания «Видеоинтернешнл» была одним из крупнейших брокеров для телевизионной рекламы в России, а также Восточной Европы. Как министр печати в первые годы после прихода Путина на пост президента, он помог укрепить контроль Кремля над национальными вещательными компаниями. Позже он участвовал в создании англоязычного телеканала Russia Today, принадлежащего государству, теперь известному как RT.

КОРОТКО

К 2060 году угроза потопа нависнет над миллиардом человек

К 2060 году более миллиарда человек будут постоянно подвергаться опасности катастрофических наводнений из-за глобального изменения климата, говорится в новом докладе британской гуманитарной организации «Христианская помощь».

Согласно этому исследованию, наибольшей опасности будут подвергаться США, Китай и Индия. Им в первую очередь будут грозить последствия повышения уровня воды в Мировом океане, среди которых – ураганные ветры.

Наибольшая опасность грозит индийским городам Калькутте и Мумбаи. Еще восемь городов из списка расположены в Азии, за ними следует Майами.

Глава Верховного суда Чечни подал в отставку

Председатель Верховного суда Чечни Магомед Каратаев написал заявление об отставке после того, как в начале мая подвергся критике со стороны Рамзана Кадырова. Он извинился перед Рамзаном Кадыровым и признал критику в свой адрес обоснованной. Об этом в воскресенье 15 мая сообщил телеканал «Грозный» со ссылкой на заявление самого Каратаева.

Накануне Рамзан Кадыров раскритиковал работу судей республики, обвинив их в вынесении противоречивых и слишком мягких решений, которые, по его мнению, продиктованы корыстными интересами. Также, по словам Кадырова, судьи затягивали сроки рассмотрения уголовных дел по существу.

Он предложил председателю Верховного суда Магомеду Каратаеву и троим судьям написать заявления об отставке. Судьи Урус-Мартановского городского и Грозненского районного судов Супьян Яндаров и Зайнди Хусаинов после критики главы республики добровольно ушли в отставку 7 мая. Сам Каратаев сначала выразил надежду, что и.о. главы республики изменит свое мнение, когда «истина будет раскрыта». Он отмечал, что Кадырова «ввели в заблуждение». Но все же был вынужден написать заявление об отставке.

Грузия проводит совместные военные учения с США

В Грузии на военном аэродроме в Вазиани прошла церемония открытия совместных с НАТО военных учений Noble Partner-2016 («Достойный партнер 2016»), которые будут проходить до 26 мая.

Подобные учения проводятся в Грузии уже второй раз. Как заявило Министерство обороны страны, их цель – отработка совместных действий военнослужащих Грузии, США и Великобритании и повышение боевой готовности грузинских военных для участия в операциях сил быстрого реагирования НАТО (NRF).

На церемонии открытия учений присутствовали представители руководства Грузии, в том числе президент Георгий Маргвелашвили и премьер-министр Георгий Квирикашвили.

«Грузия обязательно станет членом НАТО», – пообещал в своей приветственной речи Маргвелашвили.

ЗА БУГАМ

Без званкоў і ацэнак

У польскім горадзе Гданьску, які размешчаны на ўзбярэжжы Балтыкі, ствараецца школа без званкоў і ацэнак.

Прыярытэт навучальнай установы – гэта будаваць адносіны з дзецьмі, развіваючы іх зацікаўленасць і творчы патэнцыял, але без ціску на выніку па рэалізацыі вучэбнай праграмы.

Паводле сцвярджэнняў ініцыятараў стварэння школы, яны хочуць, каб дзеці «вучыліся мове сэрца». У прыватнасці, у школе будуць вучыць вырашэнню канфліктных сітуацый мірным шляхам.

Школа пачне дзейнасць з верасня. Гэта другая школа такога тыпу ў Польшчы.

БОРЬБА ЗА ЖИЗНЬ

Двухлетняя полочанка нуждается в реабилитации

В минувшем году двухлетняя Женя Кудрявцева стала инвалидом. Врачи не увидели в организме девочки батарейку, которую она случайно проглотила, и некоторое время лечили ее от бронхита.
За последнее время маленькой полочанке пришлось перенести несколько сложнейших операций.
«Народная Воля» связалась с мамой Жени и поинтересовалась ее здоровьем сегодня.

Напомним, что самочувствие двухлетней девочки ухудшилось 12 августа прошлого года. У нее пропал аппетит, началась рвота. Испуганные родители недосчитались одной литиевой батарейки, которая лежала на столе в комнате, и сразу же вызвали «скорую».

– Прежде всего мы сообщили медикам, что Женя могла проглотить батарейку, – рассказала «Народной Воле» мама девочки Екатерина Кудрявцева. *– Нас отвезли в больницу и сделали рентген брюшной полости. Как выяснилось позже, на снимке часть батарейки была видна, но ее не заметили. Врачи сказали, что у ребенка отравление, и отправили к педиатру.*

Через несколько дней состояние ребенка ухудшилось: поднялась высокая температура. Родители говорили врачам, что скорее всего в организме находится батарейка, но повторный снимок грудной клетки вновь не подтвердил предположение. Медики диагностировали у Жени бронхит и направили в детскую больницу.

20 августа у девочки начались осложнения, и она впала в кому. Ребенка положили в реанимацию. По словам Екатерины Кудрявцевой, после этого местные врачи уже не могли помочь и девочку доставили в Минск.

– Столичные медики провели операцию и извлекли батарейку из организма, – вспоминает мама Жени. *– Надеялись, что пищевод затянется, но потом снова начались осложнения: открылось кровотечение. Когда удалили пищевод, увидели, что пострадали трахея и аорта. Из-за этого пострадал мозг... Минские врачи удивлялись, как после всего этого девочка смогла выжить!*

Сейчас Женя в ожидании еще одной операции. По словам Екатерины Кудрявцевой, у девочки наблюдается положительная динамика и есть шансы на выздоровление. После операции ребенку необходима реабилитация в Словакии. Белорусские медицинские учреждения, где ребенок смог бы пройти курс восстановления, не подходят.

– В Беларуси нас на реабилитацию не берут, – объясняет мама Жени. *– Все-таки было сделано несколько операций, и не все медики готовы оказать квалифицированную помощь. В Словакии специализированная клиника, и они могут нас принять. Конечно, за деньги. Курс стоит более 4,5 тысячи евро.*

По словам Екатерины, на лечение Жени нужно немало средств. В месяц на лекарства уходит около 120 евро, кроме этого, ребенку необходим регулярный профессиональный массаж.

– Еще мы стали посещать сеансы иппотерапии, – говорит Екатерина Кудрявцева. *– Уже после нескольких поездок на лошади заметно улучшение, поэтому будем продолжать. Вообще, Женя молодец, стала крепче, недавно нас осматривал минский врач, который будет делать операцию, он был приятно удивлен сегодняшним состоянием. Одним словом, боремся...*

Врачам, которые не заметили батарейку в организме девочки, предстоит объясниться. По словам Екатерины Кудрявцевой, материалы дела на днях передали в суд.

КСТАТИ

Оказать помощь в реабилитации Жени Кудрявцевой может любой желающий

Благотворительные счета открыты в филиале 216 – г.Полоцк, ул.Ф.Скорины, 4; УНП 300230580; МФО 150801648:
– белорусские рубли – транзитный счет 3819382106849 на благотворительный счет 000020 в филиале 216, бессрочный;
– евро – транзитный счет 3819382311360 на благотворительный счет 000010 в филиале 216, бессрочный;
– российские рубли – транзитный счет 3819382311360 на благотворительный счет 000010 в филиале 216, бессрочный;
– доллары США – транзитный счет 381938211360 на благотворительный счет 000038 в филиале 216, бессрочный.

Назначение платежа: Для зачисления на благотворительный счет, открытый на имя Кудрявцевой Екатерины Викторовны на лечение дочери Кудрявцевой Жени.

Роман ВАСЮКОВИЧ.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі

(Працяг. Пачатак у №№3–20, 22, 24, 26–34, 36.)

87. Што такое «Паўлаўская рэспубліка»?

Паўлаўская рэспубліка – гэта дзяржаўнае міні-ўтварэнне (накшталт тых, што і сёння ёсць у Еўропе, – Манака, Андора, Сан-Марына ды іншыя), якое існавала на беларускай зямлі ў апошняй трэці XVIII – на пачатку XIX стагоддзя.

Стваральнікам Паўлаўскай Рэчы Паспалітай, як яна афіцыйна менавалася, быў ксёндз Павел Ксавер Берастоўскі (Бжастоўскі), які паходзіў са старадаўняга беларускага шляхецкага роду. У сакавіку 1767 года ў сваім маёнтку Мерач (на поўдзень ад Вільні, на рацэ Мерачанцы) пад уплывам ідэй філосафа Жана Жака Русо, а таксама сацыялістаў-утапістаў Томаса Мора, Анры Сэн-Сімона ды іншых абвясціў рэспубліку і распачаў прагрэсіўныя рэформы. Прыгонныя атрымалі асабістую вольнасць і з паншчыны былі пераведзены на чынш (гэтак называўся натуральны або грашовы падатак), а ўлада была перададзена сялянскай грамадзе.

Павел Ксавер Берастоўскі. Старадаўняя гравюра.

Разняволеныя людзі сталі лепш працаваць, бо зразумелі, што іх дабрабыт залежыць перш за ўсё ад іх саміх. У нябыт адышло п'янства – спадарожнік прыгнечаных. Берастоўскі склаў шэраг статутаў і рэкамендацый для практычнага ўжытку. Так, у Вільні ў 1770 годзе быў выдрукаваны дапаможнік "Лекі для карысці гаспадароў у Паўлаве".

У 1791 годзе Сойм Вялікага Княства Літоўскага зацвердзіў Статут (г. зн. канстытуцыю) Паўлаўскай рэспублікі. Паводле яго кожны жыхар лічыўся раўнапраўным грамадзянінам, меў зямлю і права быць абраным на якую заўгодна дзяржаўную пасаду. Заканадаўчая ўлада належала двухпалатнаму сойму, выканаўчая – міністэрствам, прычым усе пытанні вырашаліся бальшынёй галасоў. Пажыццёвым прэзідэнтам быў абраны П.К.Берастоўскі.

Паўлаўская рэспубліка мела школу, шпіталь і банк. Існавалі ўсе атрыбуты дзяржаўнасці: сцяг, герб, уласныя металічныя грошы. Было створана і войска з адметнай уніформай, а ў выпадку вялікай небяспекі склікалася народнае рушанне.

Сацыяльны эксперымент Паўла Ксавера Берастоўскага стаўся даволі даўгавечным: Паўлаўская рэспубліка існавала больш за паўстагоддзя – да 1824 года. Гэты гістарычны факт – як рэальная спроба ажыццяўлення ідэй свабоды, роўнасці, народаўладдзя – з'яўляецца для нас сведчаннем даўніх дэмакратычных традыцый нашага народа.

Уладзімір АРЛОЎ.

88. Хто такі Тадэвуш Касцюшка?

У шэрагу выдатных барацьбітоў за свабоду ганаровае месца належыць нашаму суайчынніку Андрэю Тадэвушу Банавентуру Касцюшку. Чалавеку, які змагаўся за вызваленне ад чужаземнага панавання народаў Паўночнай Амерыкі і Усходняй Еўропы, рабіў незабыўнае ўражанне сваёй энергіяй, мужнасцю, адданасцю ідэі свабоды.

Нарадзіўся Касцюшка ў 1746 годзе ў сям'і беларускага шляхціца, фамільны маёнтак якога знаходзіўся ў вёсцы Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер у Жабінкаўскім раёне). У 1760 годзе скончыў піярскую (каталіцкую) школу, а ў 1769 годзе – Варшаўскі кадэцкі корпус. Затым 5 гадоў вучыўся ў Парыжскай вайсковай акадэміі. На вяртанні дадому яму не знайшлося пасады ні ў войску, ні на цывільнай службе. Т.Касцюшка вымушаны быў пакінуць радзіму і падаўся ў 1776 годзе ў Паўночную Амерыку, дзе тым часам палала вайна за незалежнасць англійскіх уладанняў. На працягу сямі гадоў ён змагаўся ў шэрагах амерыканскай арміі, дзе атрымаў званне генерала і быў узнагароджаны найвышэйшым баявым ордэнам Злучаных Штатаў – ордэнам Цынцыната. Перамога ў бітве пад Саратогай у 1777 годзе ў многім была заслугай Касцюшкі.

Вярнуўшыся ў 1784 годзе на радзіму, Касцюшка доўгі час жыў у Сяхновічах. І хоць імкнуўся служыць у войску Вялікага Княства Літоўскага, яму там не знайшлося пасады, і ён змушаны быў у 1789 годзе пайсці ў польскае войска на камандзіра брыгады. Другі падзел Польшчы і Вялікага Княства, умяшанне суседніх дзяржаў у іх унутраныя справы, а таксама незадаволенасць значнай часткі насельніцтва самавольствам паноў выклікалі абурэнне, якое ў сакавіку 1794 года перарасло ў народнае паўстанне. Кіраўніком яго прызначылі Тадэвуша Касцюшку.

Задачамі паўстання было не толькі змаганне з акупантамі, але і ўстанаўленне права кожнага чалавека набываць зямлю, права выбіраць і быць абраным, скасаванне прыгону, вольнасць і роўныя правы для ўсіх і г.д.

Аднак намер зрабіць уступкі сялянам выклікаў супраціў шляхты, ісці на канфлікт з якой Т.Касцюшка не адважыўся. Гэта звузіла сацыяльную базу паўстання. На першым часе яно мела некаторы поспех, але, пасля таго як Расія і Прусія накіравалі вялікую колькасць войскаў, паўстанне было задушана.

10 кастрычніка 1794 года Т.Касцюшка, цяжка паранены ў бітве каля Мацяёвіц, быў узяты ў палон і зняволены ў Петрапаўлаўскай цытадэлі ў Пецярбургу. Пасля смерці царыцы Кацярыны II Павел I вызваліў Касцюшку і дазволіў яму выехаць за мяжу. Памёр Касцюшка ў Швейцарыі ў 1817 годзе.



Тадэвуш Касцюшка, нацыянальны герой Беларусі, Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі, ганаровы грамадзянін Францыі. Гравюра XIX стагоддзя.

Ідэі барацьбы за свабоду і незалежнасць былі блізкія Тадэвушу Касцюшку, таму ён у 1776–1783 гадах браў чынны ўдзел у вайне амерыканскага народа супраць каланіяльнай залежнасці. [illegible] Т.Касцюшка спраектаваў і пабудаваў [illegible] Філадэльфіі, [illegible] Уэст-Пойнта.

Пазней у Уэст-Пойнце была створана Вайсковая акадэмія Злучаных Штатаў Амерыкі. У 1830 годзе там паставілі помнік нашаму суайчынніку.

Язэп ЮХО.

89. Які след у гісторыі Беларусі пакінуў А.Сувораў?

Нікога, акрамя Сталіна, Леніна і Берыі, не ўшанавалі ў БССР так зацята, як Суворава. Але калі помнікі Сталіну разбураны, імя Берыі аддадзена анафеме, [illegible] Леніна ўжо [illegible] і гіпсавыя [illegible], дык культ Суворава-героя па-ранейшаму квітнее на нашай зямлі. У 35 гарадах і 24 мястэчках Беларусі яго імем названы вуліцы. Дзейнічае Кобрынскі музей, прысвечаны Сувораву. Мінскае суворaўскае вучылішча, як і раней, прышчапляе сваім выхаванцам суворaўскія прынцыпы. «Суворaўцамі» сталі нават калгаснікі 23 калгасаў, названых яго імем.

За што ж бальшавіцкі ўрад Беларусі гэтак дзякаваў «графу Рымнікскаму, князю Італійскаму, прынцу Сардзінскаму, генералісімусу ўсіх сардзінскіх армій і генералісімусу ўсіх расійскіх войскаў»? Мабыць, за бязлітаснае задушэнне паўстання Тадэвуша Касцюшкі, за карныя аперацыі супраць паўстанцаў у Беларусі. Менавіта ж за праліўную беларускую кроў імператрыца Кацярына II «пожаловала в вечное и потомственное владение» Аляксандру Суворaву Кобрынскую валасць з 13.279 душамі сялян. На душы тады лічылася мужчынскае працаздольнае насельніцтва, так што не меней за 30 тысяч беларусаў атрымаў у падарунак расійскі палкаводзец за разбіты пад Крупчыцамі корпус паўстанцаў Серакоўскага. Увесь ягоны культ у беларускую гісторыю – кроў нашых продкаў.

У гэтым доме ў 1797 і 1800 гадах некалькі месяцаў пражыў А. Сувораў. Маёнтак Кобрынскі Ключ ён атрымаў як узнагароду ад імператрыцы за тое, што задушыў паўстанне Т.Касцюшкі. [illegible]

Сувораў ніколі не ўдзельнічаў у вызваленчых войнах, ён быў тым палкаводцам, які старанна выконваў волю і пажаданні Кацярыны II і Паўла I у пашырэнні межаў Расійскай імперыі, задушэнні [illegible] мог здзейсніцца адвечная мара расійскіх цароў аб захопе беларускіх земляў. [illegible] Сувораў, [illegible] заваёўніка нашай зямлі. Афіцыйна ж удзел у кульце Суворава – сведчанне вернасці [illegible].

Кастусь ТАРАСАЎ.

Тэксты да ілюстрацый падрыхтаваў Зміцер САНЬКО.

БЕЗ ГАЛЬШТУКА

«Віцэ-губернатар» з'ехаў у Літву... на цеплаходзе

Неўзабаве з Гродна ў Друскінінкай можна будзе трапіць па вадзе.



Звычайна месцы адпачынку чыноўнікаў з'яўляюцца таямніцай. Але намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама і дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Віктар Ліскoвіч** не ўтойваў маршрут свайго непрацяглага падарожжа. Разам з літоўскімі і беларускімі чыноўнікамі ён стаў пасажырам першага пробнага рэйса на цеплаходзе "Вольга Саломава", які адправіўся з Гродна ў Друскінінкай.

Апошнім часам з аднаго горада ў другі можна трапіць толькі на машыне або аўтобусе. Літоўская частка чыгункі, якая ішла з Друскінінкая ў Гродна, была закрыта яшчэ ў 2000 годзе. А цеплаходы наогул не хадзілі з савецкіх часоў. Таму падчас "адпачынку" ў пінжаках і гальштуках Ліскoвіч дамаўляўся пра аднаўленне рэгулярных рэйсаў.

Праўда, з літоўскага боку ўжо маецца рачны пункт пропуску пасажыраў. А вось стварэнне рачнога КПП з боку беларусаў пакуль толькі ў планах.

Максім ПЛОТНІКАЎ.

ЧУЛІ?

30 долараў – за сустрэчу з Алексіевіч

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі выступіць у ЗША.

Сустрэча **Святланы Алексіевіч** з амерыканскімі чытачамі адбудзецца 12 чэрвеня ў Бруклінскай публічнай бібліятэцы па адрасе 10 Grand Army Plaza. Кошт квіткоў складзе 30 долараў. Гэта так званы bundled book purchase (гэта значыць, у кошт уваходзіць кніга пісьменніцы). Як абяцаюць арганізатары, з 29 мая ў продаж паступяць бясплатныя квіткі. Каб прэтэндаваць на сваё месца ў зале, трэба прыйсці на сустрэчу як мінімум за 5 хвілін да пачатку.

Як вядома, Бруклін – самы населены раён Нью-Ёрка. Яго насельніцтва складае 2,5 мільёна чалавек. Бруклінская публічная бібліятэка – пятая па велічыні сярод публічных бібліятэк ЗША.

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ.

ГАРДЕРОБЧИК

Оксана ВОЛКОВА: «Джинсы – это золотовалютный запас...»

Прима Национального Большого театра оперы и балета Беларуси Оксана Волкова на сцене всегда в роскошных платьях. А в жизни предпочитает простую и удобную одежду.
«Несмотря на то, что у меня полный шкаф самой разной одежды, часто я выбираю джинсы, – говорит известная артистка. – Индивидуальный шик я предпочитаю для сцены, а в жизни люблю комфортный повседневный стиль...»
На днях Оксана прорекламировала одежду известного эстонского бренда Monton. На своей странице в «Фейсбуке» она выложила небольшую фотосессию вместе с дочерью.
«Этот замечательный бренд пригласил меня выбрать несколько комплектов для меня и моей дочки Ренаты, – пояснила заслуженная артистка Беларуси. – Мы получили огромное удовольствие в примерочной, а затем и на фотосессии с замечательным Николаем Воробьевым!»

Как оказалось, артистка очень любит ходить по магазинам.

– Работа у меня энергозатратная, а во время прогулки по магазинам я получаю истинное наслаждение и расслабляюсь, *– рассказала Оксана «шопоголикам».* – Хотелось бы, чтобы на это всегда хватало средств, сил и времени. Очень люблю ходить на шоппинг с дочкой. Хотя Рената часто меня просит: «Мама, давай не пойдем в магазин». Она не очень разделяет мое желание купить очередные туфли и всегда предлагает сделать выбор в сторону чего-то полезного.

Если говорить о том, на что я обращаю внимание в магазинах, то я очень люблю черный цвет. Иногда разбавляю его яркими цветами – красным, синим, зеленым. Но большая часть моего гардероба именно черная. У меня яркая внешность, и я выбираю достаточно простые модели при условии, что они идеально на мне сидят, подчеркивая все достоинства.

У меня очень много вещей, но, к сожалению, половина не носится вообще. Часто ловлю себя на мысли, что у меня есть красивые платья, костюмы, а я, в очередной раз заглядывая в шкаф, надеваю любимые джинсы и кофточку. Просто нет времени на раздумья и долгий выбор.

Я поддерживаю лозунг «Купляйте беларускае!». Выбирая вещи белорусских брендов, всегда получаю множество комплиментов за рубежом. Кроме того, часто белорусские дизайнеры отшивают коллекции небольшими партиями, что исключает возможность встретить такую же вещь еще на ком-то. А все раскрученные марки можно безошибочно определить. По той же причине за рубежом всегда захожу в магазины незнакомых мне местных брендов – это шанс найти что-то эксклюзивное и интересное. Такие вещи я ношу очень долго и никогда не выбрасываю.

При этом считаю, что не стоит платить за одежду много. Два раза наденешь и выбросишь. Поэтому если передо мной какая-то очень дорогая вещь и она мне нравится, то я 10 раз подумаю, прежде чем ее купить. Это правило, правда, не работает в случае с обувью, сумками и верхней одеждой. Зато я очень радуюсь, когда удается купить что-то очень красивое и дорогое на распродажах или в аутлетах.

Больше всего люблю покупать концертные платья, и, если платье сидит, как влитое, его цена, как правило, не имеет значения. Есть такой магазин в Нью-Йорке – Saks. Я с нетерпением жду момента, когда приеду туда, и знаю, что обязательно там что-нибудь куплю. Выбираю, как правило, классические модели, которые всегда актуальны.

Еще люблю джинсы. Это такой золотовалютный запас в гардеробе, который всегда выручает в трудную минуту...

ЗЕМЛЯКИ

Белорусская зарубежница

Тася НИКИТЕНКО родилась в Витебске, но уже несколько лет живет в Москве. Во время зимнего протеста российских дальнобойщиков девушка была пресс-секретарем в лагере бастующих водителей. А в крепкие морозы студентка из Беларуси помогала организовать доставку дальнобойщикам питания.
О протестных настроениях в России и Беларуси, об участии в движении Михаила Ходорковского и о том, как демократические силы в Москве относятся к нашей стране, Тася Никитенко рассказала «Народной Воле».

Солидарность по-московски

– Как уроженка Витебска оказалась в российской столице?

– Отъезд был связан с продолжением образования. Я хотела заниматься журналистикой, а в Беларуси небольшой выбор учебных заведений, где готовят специалистов этой профессии. Поэтому решила, что лучшим вариантом будет Москва. Сейчас я студентка частного Института журналистики и литературного творчества.

– Как руководство института относится к вашей активной гражданской позиции?

– Общественной деятельностью я занялась уже после переезда в Россию. В нашем вузе обучалась участница панк-группы «Pussy Riot» Маша Алехина, поэтому руководство вуза было знакомо с активными студентами. Лично у меня проблем в институте на этой почве не возникало.

– А как вы совмещали учебу с помощью дальнобойщикам?

– Когда я поняла, что мне физически не хватает времени на учебу и помощь протестующим, пришла к ректору и объяснила ситуацию. Конечно, я не забывала, что являюсь студенткой, но в той ситуации ко мне отнеслись с пониманием, и проблем не было.

– А почему вы вообще решили помогать водителям, не согласным с введением системы «Платон»?

– Изначально я просто следила за их протестами, и мне было интересно, когда же они приедут из Петербурга в Москву. Люди добирались около недели: их постоянно проверяли, останавливали и так далее. И когда они все-таки добрались до Москвы, я отправилась к ним на стоянку, чтобы привезти еду и хоть как-то помочь. И так получилось, что задержалась там на три месяца.

– Слышал, что солидарны с протестующими были и обычные жители Москвы...

– От рядовых граждан была колоссальная поддержка. Люди привозили еду, питьевую воду, забирали грязную одежду для стирки, кто-то приглашал дальнобойщиков домой, чтобы они могли принять душ. Одним словом, люди были неравнодушны.

– В одном интервью вы сказали: «*Трудно представить, чтобы сейчас белорусы поддержали протест рабочих...*»

– На тот момент мне было сложно представить проведение аналогичной акции протеста в Беларуси.

– Сегодня так же думаете?

– Мне кажется, что недовольство населения нарастает, и поведение белорусских предпринимателей тому подтверждение. Но на сегодняшний день я не вижу человека, который вывел бы белорусов на улицы.

– Некоторые политологи утверждают, что в российском обществе растет уровень протестных настроений. Замечали такую тенденцию?

– Конечно. Например, в Москве на данный момент немало «горячих точек». Люди протестуют против застройки городских парков, выступают против выселения библиотек, дальнобойщики до сих пор добиваются отмены системы «Платон». Недовольство постепенно нарастает, и это очень заметно.

Радует, что протестующие социальные группы могут объединяться и помогать друг другу. С дальнобойщиками мы несколько раз ездили на Торфянку – это московский парк, который собираются застроить. Люди живут в палатках уже несколько месяцев и не пускают туда технику. Отдельные группы недовольных идут на диалог друг с другом, и это приятно.

Возвращаясь к предыдущему вопросу... Все очень индивидуально: Россия и Беларусь государства с разной историей и менталитетом населения. И было бы наивно считать, что то, что действует в России, сработает и в Беларуси.

– По белорусскому телевидению говорят, что мы братья...

– Много чего приходится слышать по телевизору *(смеется)*.

Не предавая Беларусь

– Тася, знаю, что вы являетесь участницей движения Михаила Ходорковского «Открытая Россия». Чем занимаются активисты этого проекта?

– Здесь довольно широкий спектр задач. Есть правозащитный департамент, работающий с людьми, которых пытаются лишить свободы за репосты в социальных сетях, за какие-то политически мотивированные дела.

Действует проект «Открытые выборы», где осуществляется набор кандидатов, которых Ходорковский поддержит на выборах либо в Государственную думу, либо в законодательное собрание.

Я работаю в интернет-редакции «Открытая Россия» и занимаюсь подготовкой видеорепортажей, написанием текстов.

Сейчас против кандидатов, которые собираются принять участие в выборах, предпринимаются провокации. На страницах в социальных сетях или при обысках у людей «находят" фашистскую символику, заводят административные дела и, как следствие, не допускают к выборам.

– Не страшно молодой девушке поддерживать проект Михаила Ходорковского, учитывая недоброжелательное отношение к нему российских властей?

– Иногда, конечно, бывает страшно. Но к проекту я присоединилась уже после протеста дальнобойщиков, поэтому уже мало что пугает.

– Многие в молодом возрасте предпочитают развлекаться в ночных клубах и держаться подальше от политики. Знакомые не спрашивают, зачем вам все это?

– Думаю, что это ошибочное мнение, во всяком случае меня окружают молодые люди с активной гражданской позицией. И потом, общественная деятельность не мешает заниматься любимыми увлечениями.

– Время на личную жизнь остается?

– Если честно, я не переживаю из-за этого. На данный момент моя деятельность важнее личной жизни. Ну а поклонники знают, чем я занимаюсь *(смеется)*.

– Тася, а почему белоруска отстаивает демократические свободы в России? В Беларуси ведь тоже не все гладко с правами человека.

– Не думаю, что у демократических прав есть разделение на российские и белорусские. Если я занимаюсь общественной работой в России, то это не значит, что каким-то образом предаю Беларусь. Думаю, что это одинаково полезно. К тому же для «Открытой России» я стараюсь делать материалы о Беларуси, хотя это и не наш формат.

На данный момент я живу в Москве, что также является одной из причин. Учебу закончу через два года, что будет дальше, я предпочитаю не загадывать. Беларусь – моя родина, и возможности возвращения не исключаю.

– А как российские демократические силы воспринимают Беларусь?

– Отношение к Беларуси неоднозначное. Демократические силы, на мой взгляд, относятся уважительно и воспринимают Беларусь как самостоятельное государство, а не как «российский аппендикс».

– Беларуси нужно опасаться российской агрессии?

– Ожидание агрессии после аннексии Крыма – нормальная реакция. Подобного мнения придерживаются, например, в Казахстане – считают, что они следующие.

Ни в коем случае не стоит поддаваться таким настроениям и ударяться в русофобство. Неправильно грести многомилионный российский народ под одну гребенку.

– Тася, о политической карьере не задумывались?

– Политика – точно не мое, я себя комфортнее чувствую в качестве журналиста.

– Как реагируют ваши родные, зная, что вы выходите на улицу с плакатами, участвуете в акциях протеста?

– Несмотря на то, что моя общественная деятельность родителям не нравится, конфликтов на этой почве у нас не возникает. Я взрослый человек и могу выбирать, что мне делать и чем заниматься. И родные это понимают.

Роман ВАСЮКОВИЧ.

ЗАБЫТЫЕ ИМЕНА

Епископ Полоцкий, Патриарх Грузинский

В январе 1915 года по старому стилю новым епископом Полоцким и Витебским был назначен человек с редкими для этих мест именем и фамилией – Кирион (Садзегелли, или Садзаглишвили). Фактически в Беларуси он находился в ссылке за свою горячую приверженность восстановлению автокефалии Грузинской Православной Церкви, которая была ликвидирована в 1811 года после присоединения Грузии к России.

Из родной Грузии епископа Горийского Кириона за автокефальные взгляды сослали еще в начале 1900-х годов. Сначала он служил викарным епископом в Подольской епархии, затем – Херсонской, а потом – управляющим епископом Орловской епархии. Лишь в 1906 году ему разрешили вернуться в Грузию и занять Сухумскую кафедру.

Однако уже в 1907 году его назначили епископом Ковенским, а в 1908 году вообще сняли с него епископский сан и сослали в монастырь: сначала в Харьковской, а затем в Тамбовской епархии. Дело в том, что 28 мая 1908 года в Тбилиси был застрелен русский экзарх Грузии архиепископ Никон (Софийский). Виновными в организации убийства российские власти посчитали грузинских иерархов-автокефалистов, которые за это подверглись репрессиям.

Лишь в 1915 году Кирион (Садзаглишвили) был восстановлен в сане. Но на родину его так и не пустили – назначили епископом Полоцким и Витебским. На время служения иерарха в Беларуси выпали события Первой мировой войны, сопровождавшиеся беженством и эвакуацией. В том числе он лично провожал в сентябре 1915 года мощи преподобной Евфросинии Полоцкой, которые были эвакуированы в Ростов.

Затем к событиям войны добавилась и Февральская революция, в ходе которой в России было свергнуто самодержавие. 5 марта 1917 года полоцкий епископ направил приветственную грамоту Временному правительству, а вскоре даже стал одним из немногих епископов, изменивших ставленническую присягу, в которой все упоминания об императоре заменил упоминанием Временного правительства.

В апреле 1917 года епископ провел экстренный епархиальный съезд духовенства, церковных старост и представителей прихожан, чтобы обсудить устройство церковно-приходской жизни в изменившихся условиях. На съезде были определены задачи, на решении которых должно было сосредоточить свои силы духовенство, было принято решение о проведении реформы в епархиальных учебных заведениях и так далее.

Но даже в Полоцке епископ Кирион (Садзаглишвили) не забывал о Грузии. Здесь вышли некоторые его труды по истории грузинской истории и церковной жизни.

1 августа 1917 года иерарх по своей просьбе был уволен от управления епархии и уехал в Грузию, где в марте было объявлено о восстановлении автокефалии. А уже в сентябре Кирион (Садзаглишвили) был избран на патриарший престол. 1 октября 1917 года он был интронизирован, став 72-м Католикосом-Патриархом всея Грузии и первым после 1811 года. В 2002 году Священный Синод Грузинской Православной Церкви причислил его к лику святых.

Максим ГАЦАК.

ОБЩИЙ ПЛАН

На «Спартак» в постановке Валентина Елизарьева все билеты выкупили врачи

На протяжении 35 лет балет «Спартак» в постановке Валентина Елизарьева остается одной из самых популярных отечественных театральных постановок. Он покорил зрителей множества стран, в том числе Великобритании, Японии, Голландии, Франции, Турции.

В афише Национального Большого театра балет «Спартак» стоит не регулярно, но в этом месяце его дают два раза – 20 и 22 мая. И если на 22-е еще остались свободные места по краям партера и на балконе, то на 20-е весь зал продан – билеты заранее выкупили организаторы Международной конференции анестезиологов, которая пройдет в Минске в это время на базе 9-й клинической больницы. И это не впервые, когда врачи в качестве культурной программы своих семинаров и конференций предлагают коллегам Большой театр. «Это у них уже стало хорошей традицией, – сказал первый заместитель генерального директора Большого театра Владимир Рылатко. – Как, впрочем, и милиционеров – Академия МВД тоже любит культпоходы в наш Большой».

Будет ли присутствовать на своих спектаклях Валентин Николаевич Елизарьев? Возможно. Пока он специального приглашения от администрации театра не получил.

Виктория ДРОЗД.

СТОП-КАДР

900 лошадей и полторы тысячи певцов и музыкантов

В Виндзоре состоялся колоссальный гала-концерт в честь 90-летия королевы Елизаветы II. В воскресенье завершилось конное шоу. Это единственное время в году, когда Виндзорский дворец открыт для посетителей. Елизавета II – известная любительница лошадей. В этом году принадлежащая королеве лошадь победила в одном из конкурсов. Ее величеству достался приз – купон в супермаркет.

Посмотреть на праздник собрались более десяти тысяч человек.

З-ПАД ПЯРА

Пісьменніцкія показкі Уладзіміра Сіўчыкава.

«Макавеі»

Зайшлі два маладзёны на дачны ўчастак да Вальжыны Н., спачатку спыталі, а потым сталі патрабаваць, каб павырывала і аддала ім макі.

Гаспадыня абуралася, адпрэчвала нязваных гасцей, але тыя не зважалі нават на яе мужа, які на шум выйшаў з дому.

– Слухай, цётка, не раві! Аддавай макі па-харошаму, пакуль мы яшчэ добрыя!

– Нішто сабе, добрыя – убіліся на чужую сядзібу без дазволу ды яшчэ тут камандаваць будуць!

– Канечне, добрыя! Другія даўно сілком павырывалі б тое, што трэба, змультавалі б табе кусты дый павытоптывалі б грады. Урэшце, сваё патрабуем!

Вольга ледзь не захлынулася ад абурэння:

– Гэта што ж тут ваша?!

– А тое, што трэба! Хіба ты гэтыя макі садзіла?! Мы ж па вясне і падсыпалі насення на твае ўскапаныя грады! А вераб'і пад суседскім плотам, думаеш, чаго валяюцца ў пяску дагары нагамі? Надзяўбліся нашых канапляў...

– Якіх яшчэ канапляў?!

– А вунь тых кусцікаў з жоўтымі мяцёлкамі. Спытайся ў свайго мужыка: ён у цябе ў акулярах, на разумнага падобны.

– Дык вы ў нас, аказваецца, арандатары?!

– Слухай, цётка, харош далдоніць! Нам няма калі – у нас у шалашы на ўзлеску сяброўка загінаецца, а ты тут пустое балабоніш! Ломка ў чалавека, урубаешся?

– Дык вы наркаманы?! – ледзь не села долу гаспадыня.

– Ага, зараз табе даведкі з наркадыспансера пакажам!

– А што, як я ў міліцыю пазваню?!

– Звані, калі мазгі ў цябе курыныя. Самой жа потым горш будзе!

Тут Віталь, мужчына пенсіённага веку, мякка папрасіў жонку сысці ў дом, пааддаваў няпрошаным візіцёрам злашчасныя макі, а пасля той ліхтугі доўга і разважліва супакойваў узнерваваную кабету:

– Ну, падумай сама. Падумай як след і без эмоцый! Вось мы з'едзем у горад, а яны, можа, яшчэ тыдзень прабавяцца ў сваім будане. А як будуць раз'юшаныя, дык прыцягнуцца ў любы момант дый навычвараюць тут, што ўздумаюць. Захочуць, шыбы паб'юць, а захочуць і яшчэ што горшае ўчыняць, каб папомсціцца! Узімку вунь з дзясятак дамоў абрабавалі, а дзе былі тыя вартаўнікі, дзе была тая міліцыя?! Павер, мы перад такімі прыхаднямі і злодзеямі практычна безабаронныя...

3 жніўня 2010 года.

Жаба душыць

Алена М., дырэктарка Літаратурна-мемарыяльнага музея, у якім не адзін год праводзіўся нацыянальны конкурс бардаўскай песні, не схацела ўключыць у склад журы Уладзіміра С.

Паэт і бард Алесь К., які прапаноўваў ягоную кандыдатуру, не ўстрымаўся і спытаў у яе:

– А чаму?

– Занадта ён тусовачны, занадта часта бывае на прыёмах, якія ладзяць еўрапейскія амбасады!

– А хіба гэта мае дачыненне да нашага конкурсу?! – здзівіўся Алесь. – І адкуль вы пра тое ведаеце?

– Дык я яго там сама бачу!

– Значыць, вам бываць там можна, а яму чамусьці – не?!

– Ну, дык я – зусім іншая справа! Мне належыць, бо я – асоба дзяржаўная! – безапеляцыйна адказала дырэктарка.

Уладзімір, якому Алесь пераказаў дыялог з "дзяржаўнай асобай", сцепануў плячыма.

– Аказваецца, ёсць у нас людзі першага, дзяржаўнага гатунку і другога, прыватнага. Quod licet Jovi, non licet bovi?* Тым болей, што і праўда, паводле ўсходняга гараскопу я Цялок. А калі пераасэнсаваць старажытнае лацінскае выслоўе, дык вынікае, што па-ранейшаму самая распаўсюджаная беларуская жывёліна – жаба!

– Тая самая жаба зайздрасці, якая душыць, душыць і душыць? – выказаў здагадку Алесь.

– А нягож! Вось толькі не хочацца разумець, чаго, навошта ёй камусьці зайздросціць?!

– Мяркуй сам.

– Нібыта заможная шляхцянка, ледзь не асабіста распараджаецца цэлым палацам – двухпавярховікам Дома-музея ў парку, што ў самым цэнтры сталіцы. Ёсць у яе не адзін тузін штатных супрацоўнікаў і чатыры дальнія фальваркі ў рэгіёнах на дзясяткі гектараў зямлі.

– А я яшчэ нагадаю пра Chevrolet Master Deluxe GA, які савецкі ўрад падарыў класіку напрыканцы трыццатых гадоў. Ён пацягне сёння не менш як на сто тысяч еўра!

– Аніхто не замінае шаноўнай спадарыні каардынаваць навуковую, даследчыцкую і метадычную працу, выдаваць каталогі, матэрыялы канферэнцый і нават грунтоўныя альбомы. Як гаспадыня, можа запрашаць яна неардынарных асоб і праводзіць у музеі цікавыя выставы ды імпрэзы...

– Да ўсяго гарантаваны ёй стабільнае дзяржаўнае фінансаванне і пачэсны статус не толькі ў культурніцкай грамадзе, – зноўку дадаў Алесь.

– Ну дык чаго яшчэ можна жадаць?! Якой трасцы камусьці зайздросціць, навошта цвяліць сабе душу і пячонку?!

На Купалле. 2011 год.

* *Што дазволена Юпіцеру, не дазволена быку (лац.).*

Палітычная тапанімія

Мастак-графік Рыгор С. кажа:

– Ёсць пэўная адметнасць беларускай тапанімікі. Калі хочаш уведаць імёны ворагаў Беларушчыны, дык прайдзіся хаця б па цэнтральных сталічных вуліцах, удумайся ў іхнія найменні!

І праўда, многія асобы, імёны якіх можна прачытаць на шыльдах, не прымалі права беларусаў на нацыянальнае самавызначэнне і дзяржаўную самастойнасць, непасрэдна спрычыніліся да фізічнага знішчэння найвыдатнейшых сыноў і дачок Беларусі!

Адзін з бальшавіцкіх лідараў, латыш з паходжання нібыта Вільгельм Кнорын (а папраўдзе Кнорыньш!) выпраўляў рэгулярныя часці Чырвонай арміі задушыць Слуцкі збройны чын наступнымі словамі: "Гэта наша, расійская тэрыторыя. І я паўтараю: тэрор! І татальнае знішчэнне нацыянальнай заразы, інакш запалымнее ўвесь Паўночна-Заходні край, за які Расія змагалася стагоддзямі і нікому саступаць не намервaецца. І мы, бальшавікі, лічым, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй і што тыя этнаграфічныя асаблівасці, якія адрозніваюць іх ад астатніх рускіх, трэба выкараніць. Мы, інтэрнацыяналісты, павінны будзем не толькі адабраць у іх гісторыю, але і назаўсёды пазбавіць іх гістарычнай памяці. Гэта магчыма ажыццявіць толькі пры поўнай ліквідацыі іхняй інтэлігенцыі, якая цалкам заслужыла гэтага ўжо сваім з'яўленнем..."

– Дык чым гэты цемрашал і крывасмок лепшы за крывавага генералісімуса Суворава альбо за Мураўёва-вешальніка?! – пагаджаецца з Рыгорам Уладзя. – Але і сёння, на вялікі жаль, нястомна шчыруюць іхнія паслядоўнікі – імперскія ідэолагі дый і вычварэнцы-янычары! І сёння найінтэлігентнейшыя асобы, інтэлігенты ў трэцім і нават чацвёртым пакаленнях мусяць жыць на вуліцы імя крыважэрнай бальшавіцкай пачвары!

8 верасня 2011 года.

Кавун

Набыў Уладзя на Заслаўскім базары важкі, з паўпуда кавун.

Прывёз яго на лецішча дый падкаціў у цянёк, у гарбузовую граду, пад лапушыстыя лісты, дзе глядзеўся той вельмі натуральна.

Завітаў да Уладзі на ўчастак сусед Іван Б. нібыта паглядзець тэмпературу паветра ў цяні, пад паветкаю, дый ледзь не аслупянеў, калі агледзеў паласатага таўстуна:

– Валодзя, дык а што гэта ў цябе на градзе? Кавун?!

– Ну кавун, а што?

Пенсіянер змяніўся з твару, не сказаў больш ані слова і пашнураваў на свае соткі, бо, казалі суседзі, успрымаў чужыя сельскагаспадарчыя поспехі ледзь не як асабістую крыўду.

Другі сусед, Базыль Г. звыкла зайшоў пазычыць сякеру дый таксама не змог не запытацца пра пасястае дзіва.

– Гаспадыня ў мяне працавітая і дбайная, – увайшоў у ролю Уладзя. – А лета, сам ведаеш, было спякотнае, дый дажджоў хапала. Вось і вырас такі прыгажун!

– Вольга! Каця! – не ўстрымаўся дый праз плот загукаў да жонкі з дачкою Базыль. – Займаецеся тут розным марнатраўствам, а ў людзей вунь кавуны павырасталі!

Пад вечар купілася на досціп і Уладзева братавая Ірына, якая прыйшла на сямейную вячэру з садовага таварыства "Лысая Гара".

– А што, мой кавун, – дык дзе хачу, там і трымаю! – напаўжартам нібыта апраўдваўся перад сямейнікамі Уладзя. – Пасмакуем у альтанцы, які ён сакаўны і салодкі.

24 верасня 2011 года.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
17 МАЯ 2016 г.

ВНЕ ИГРЫ

Позор!

Сегодня хоккейная сборная Беларуси проведет на чемпионате мира, который проходит в России, последний матч.

Когда белорусская команда проиграла первые три матча топовым сборным – американцам, финнам и канадцам, многие посетовали на силу соперников. Когда в четвертой игре турнира белорусы, проигрывая после двух периодов со счетом 0:2, вырвали победу у словаков (4:2), все дружно запели дифирамбы белорусским хоккеистам, которые «встали с колен». Так сказать, надеялись и верили. Увы…

И судьбоносным для сборной Беларуси было даже не поражение от команды Германии (2:5), которую мальчиком для битья уже давно никто не называет, а унизительная оплеуха от венгров. Белорусская команда проиграла 2:4 19-й команде в рейтинге Международной федерации хоккея, которая не выступала в элите 7 лет, не побеждала здесь 77 лет и умудрилась проиграть две подряд домашние олимпийские предварительные квалификации голландцам и полякам. Более того, последний раз столь результативный поединок сборная Венгрии провела в далеком 1939 году! До сих пор наша команда встречалась с этим соперником десять раз и в девяти случаях побеждала. Единственная ничья (4:4) случилась в рамках «Евровызова»-2012/2013.

Обиден был не только проигрыш, но беззубость и слабохарактерность команды в последнем матче, наплевательское отношение к журналистам, а значит, и болельщикам. После матча с венграми представители белорусских СМИ попросили в микст-зоне капитана сборной Андрея Стася дать оценку игре. В ответ услышали трехэтажный мат! Правда, на следующий день хоккеист извинился: мол, эмоции взяли верх. Но, на мой взгляд, поведение Стася и есть показатель того, что хоккей в стране превратился в этакий приблатненный вид спорта.

Кстати, Алексей Калюжный еще до начала чемпионата мира передал через пресс-службу федерации просьбу «его не трогать». Коллеги отмечали, что не видели, «чтобы весельчак по жизни Серега Костицын отказал в интервью российским репортерам в перерыве или после матча КХЛ с участием его «Торпедо», но сейчас он ни разу не остановился в микст-зоне, всем видом показывая отвращение. Зато на одной из тренировок, когда подошел зарубежный корреспондент, и Сергей, и его брат Андрей согласились поделиться с ним планами о возвращении в НХЛ».

А вот венгерские хоккеисты после исторической победы над белорусами приняли душ и отправились в фан-зону к своим болельщикам, чтобы вместе разделить радость победы. Чувствуете разницу в отношении?!

Сегодня сборная Беларуси проведет последний на этом чемпионате матч с командой Франции. Расклады могут быть разные. При удачном стечении обстоятельств (победа белорусов и проигрыши ближайших соперников) наша сборная может войти в десятку лучших команд. При худшем сценарии вообще может занять в группе последнее место и вылететь из элитного дивизиона.

А вообще, как сказал после матча с венграми канадский белорус Кевин Лаланд: «Это позор!» Коротко и по делу.

Алесь СИВЫЙ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Дзяніс ШУНТО:

«Ад таго, як згуляем з «Дынама», многае залежыць…»



*Сталічны футбольны клуб "Крумкачы", які ў гэтым сезоне стартаваў у вышэйшай лізе, стварыў ужо шэраг сенсацый. Адзін з сузнавальнікаў клуба **Дзяніс ШУНТО** распавёў "Народнай Волі" пра тое, чым сёння жыве каманда.*

Нагадаем, сам выхад у вышэйшую лігу паўаматарскай каманды ўжо стаў у пэўным сэнсе сенсацыяй. А ў апошнім туры "Крумкачы" не менш сенсацыйна перамаглі ў гасцях аднаго з лідараў беларускага футбола – салігорскі "Шахцёр", які апошнія шэсць гадоў нязменна станавіўся прызёрам чэмпіянату краіны (у мінулым сезоне – бронзавым).

– Асабіста я таксама лічу вынік у Салігорску маленькай сенсацыяй, – прызнаецца **Дзяніс ШУНТО**. – У "Шахцёра" ж бюджэт у разы большы, чым у нас. Адпаведна, і ўмовы для падрыхтоўкі да чэмпіянату, для камплектавання каманды адрозніваліся, як неба і зямля. Зрэшты, мы рыхтаваліся да перамогі, разумелі, што шанцы ёсць заўсёды.

– За кошт чаго робяцца магчымымі перамогі над топавымі камандамі? Добрая арганізацыя, самаадданасць футбалістаў?

– У нас вельмі добры трэнерскі штаб, а ў матчы з "Шахцёрам" галоўны трэнер Алег Дулуб наогул, як мне падаецца, правёў ідэальны матч.

– Вы задаволены, як стартавалі "Крумкачы" ў чэмпіянаце?

– А чаму я павінен быць незадаволены, калі каманда ўверсе турнірнай табліцы? Мне падабаецца, як гуляем, бываюць моманты, калі атрымліваю поўнае задавальненне ад таго футбола, што паказваем. І ўвогуле, мяркую, мы павінны былі ўзяць большую колькасць ачкоў, чым зараз маем.

– Некаторыя кажуць, што "Крумкачы" становяцца ў Мінску, так бы мовіць, народнай камандай. Яе любяць, шмат хто падтрымлівае...

– Падтрымка балельшчыкаў заўсёды дадае сіл футбалістам, і гэта не пустая балбатня. Добрае слова і котка любіць, а тут столькі аматараў футбола жадаюць нам поспеху! Гэта вельмі важна. Пакуль на нашых матчах наведвальнасць гледачоў добрая, але можа стаць яшчэ лепшай пасля таго, як згуляем яшчэ з адным лідарам – сталічным "Дынама". Мяркую, на стадыён прыйдзе шмат аматараў футбола (абедзве ж каманды мінскія), і ад таго, што мы пакажам падчас гэтай гульні, будзе залежаць і далейшая падтрымка нашай каманды.

– Яшчэ напярэдадні першынства вы заяўлялі, што заробкі ў футбалістаў вашай каманды будуць не вельмі высокія – у сярэднім 7–10 мільёнаў рублёў у месяц. Магчыма, хлопцы атрымліваюць добрыя прэміяльныя за перамогі?

– Шчыра прызнаюся, у фінансавым плане маем складанасці. Заробкі засталіся такія ж, якія я і агучваў, з'явіліся нават некаторыя праблемы і з іх выплатай. Хацелася б, безумоўна, прэміраваць футбалістаў за іх перамогі, бо яны гэта рэальна заслужылі, але пакуль такой магчымасці няма. Зрэшты, усе ставяцца да сітуацыі з разуменнем, хлопцы, можна сказаць, гуляюць ды выйграюць не за грошы. І трэба шукаць выйсце. Бо, калі каманда перамагае саперніка, у якога бюджэт у 6–7 разоў большы, але няма грошай, каб узнагародзіць ігракоў за іх маленькі подзвіг, то гэта няправільна.

– Некаторыя мяркуюць, што ў "Крумкачоў" можа проста не хапіць сіл на ўвесь чэмпіянат. Што б вы адказалі гэтым песімістам?

– У каманды вельмі роўны склад – 18–20 чалавек прыкладна аднаго ўзроўню. Ніякага правалу па гульні быць не павінна. Калі не будзе нейкіх глабальных фінансавых праблем (футбалістам, скажам, і на ежу заробку не стане хапаць), то ўсё будзе добра. Я веру ў каманду і веру ў новыя перамогі!

Алесь СІВЫ.

P.S. *Сёння вечарам "Крумкачы" згуляюць чарговы матч першынства – з мінскім "Дынама". Можа быць, станем сведкамі яшчэ адной сенсацыі?*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Букет медалёў Меліціны Станюта

Беларуска Меліціна Станюта перамагла ў індывідуальным шматбор'і на Гран-пры Бухарэста па мастацкай гімнастыцы.

У фіналах асобных практыкаванняў Меліціна тройчы падымалася на вышэйшую ступень п'едэстала: у практыкаваннях з лентай, абручом і мячом. Толькі выступленне з булавамі прынесла ёй чацвёртае месца.

Нагадаем, наступны этап Кубка свету пройдзе з 20 па 22 мая ў Мінску ў спартыўна-забаўляльным комплексе «Falcon Club».

ШАШКІ

Віншуем юбіляра!

Свой 60-гадовы юбілей адзначыў вядомы беларускі шашачны кампазітар і ігрок-практык **Валерый Іванавіч Свізінскі**. Нагадаем, што ён быў пераможцам другога чэмпіянату Беларусі па шашачнай кампазіцыі 1976 года ў катэгорыі "праблемы-64". Пасля працяглага перапынку ён зноў вярнуўся да свайго захаплення шашачнай кампазіцыяй. На дыяграме адна з яго сучасных праблем. Спадзяёмся, што яна спадабаецца нашым чытачам.



№1 **Белыя**: b2, b6, d4, d6, e3, f2, g1, g3 (8). **Чорныя**: a7, b4, b8, e7, f6, f8, g5, g7, h4, h6 (10). bc7, b6, a3, ef4, b6, g5, g5(f6, d6), a7 x

Пастаянны аўтар

На гэты раз на 64-клетачнай дошцы прапануе свае творы наш пастаянны аўтар **Юрый Мурадаў** з Барысава.

№2 **Белыя**: : a1 ,c3 ,c5, d4, d6, e3, e5, f6, g1, h4 (10). **Чорныя**: a3, a5, b2, d8, f2, f8, g3, h2, h8 (9). g7(f6**VP1**), g7, e7, b6, b4, d:g5(f:d4), **I**h:f2, g3, h2 x

VP1(h6), e7, g7(f6**a**), b6, b4, g5(d4**b**), h:f2(f4), g3, h2 x

Ie5?(d6), f2(**Y**c5), e3(b4) = **Y**(e5),e3 x **a**(f8), b6, b4, d8, e5(f2), e3(g1), d6 x **b**(h:d2), a:e1 x

№3 **Белыя**: a1, c1, c5, d4, e1, e3, e5, f2, g1, g5 (10). **Чорныя**: a3, a7, b2, b4, b6, b8, c3, d8, e7, f6, g7, h4 (12). cd6, e7, f4, h2, ed2, a:c7, h:f2 x

На 100-клетачнай дошцы прапануе новыя творы другі пастаянны аўтар **Іван Наўроцкі** з Мінска, іх мы прапануем рашыць самастойна. Патрэбна знайсці выйгрыш за белых пры іх першым ходзе.

№4 **Белыя**: 7, 11, 17, 20, 26, 27, 29, 31, 32 (9). **Чорныя**: 2, 15, 18, 19, 38, 41, 42, 43, 44 (9).

№5 **Белыя**: 19, 21, 23, 25, 28, 38, 42, 46, 48 (9). **Чорныя**: 7, 8, 9, 10, 14, 16, 20, 31, 37 (9).

Госць з Украіны





Сёння ў нас у гасцях прадстаўнік адэскай школы шашачнай кампазіцыі выхаванец нястомнага прапагандыста гэтага напрамку **Аляксандра Малюты**. У рускіх шашках прапануем праблемы **Сяргея Губачкіна**, які ўпэўнена перамог у асабістым заліку матча дружбы Украіна–Беларусь 2015 года, а таксама ў чэмпіянате Украіны 2015 года ў жанры "праблемы-64". Другі прызёр Міжнароднага конкурсу "Жамчужыны Палесся". Разглядзеўшы ніжэй новыя творы, чытачы пагодзяцца, што гэта не апошнія дасягненні аўтара.

№6 **Белыя**: b4, b6, c5, c7, e5, f4, f6, g5 (8). **Чорныя**: a5, b2, c3, d2, d4, e3, f2, f8, h4 (9).

d8, a5, d8, fe7(d4**a**), b6!(g5**AB**), a3, e1 x **A**(d6), a7, e1 x **B**(c7), d8, a1 x **a**(d6), c7, a1 x

Што тут скажаш, таленавіты твор таленавітага маэстра! Пачатковая маятнікавая гульня сустракалася і ў праблемах другіх кампазітараў (напрыклад, у В.Грабенкі), а вось далейшая варыянтная развязка проста заваражвае. Цудоўна!

№7 **Белыя**: b4, b6, c5, c7, d6, e5, f4, g5 (8). **Чорныя**: a5, c3, d2, d8, e3, f2, h6 (7).

e7(d4**A**), d8, a5, d8, gf6, c3 x **A**(h4), ed6, d8, cb6, d6 x Выдатная варыянтная развязка з першага ходу і дакладнай гульнёй у абодвух варыянтах.

Супаставім рашэнні

Рашэнне пазіцый аўтарскага бліц-конкурсу **Івана Наўроцкага**:

№1 – 20, 9, 7, 2, 26 x **№2** – 11–7, 11, 2, 50, 46 x **№3** – 14, 24, 8, 2, 46 x

№4 – 22, 12, 1, 10, 29, 24, 14 x **№5** – 12(26**A**), 18, 28, 3, 32, 25, 4 x

A(28), 22, 28, 3, 32, 25, 36 x

Першымі свае адказы даслалі: **Юрый Голікаў** (Цвер, Расія), **Віталь Варушыла**, **Іван Наўроцкі** (Мінск), **Аляксандр Шурпін** (Івянец), **Уладзімір Бандарык** (Лугавая Слабада Мінскага раёна), **Мікалай Зайцаў** (Баранавічы), **Рыгор Краўцоў** (в.Рублеўск Круглянскага раёна). Пераможцам прызнаны **Аляксандр Шурпін**.

Рашэнне праблемы **№8** – c5(d4:b6**A**), b8(e3), c7, f4, a5 x **A**(d8:b6), g5(c5), b6, f6, f6 x

Але да мэты вядзе і ход cd8 x з вялікай пазіцыйнай перавагай.

На заканчэнне прапануем новую задачу на 100-клетачнай дошцы **Аляксандра Шурпіна**.

№4 **Белыя**: 10, 20, 23, 24, 39, 40, 42, 49, 50, дамкі 4, 14, 32, 44, 46, 48 (15). **Чорныя**: 3, 13, 15, 25, 35, дамкі 2, 8, 9, 17 (9). Белыя пачынаюць і пазбаўляюць ходаў 2 шашкі чорных.

18, 27, 11(16**AB**), 42–37(4**C**), 5, 10, 14, 9, 19, 24, 34, 45 (35.40).

C(24), 14–9, 33, 20, 10, 14 (5.44). **A**(4), 42–37, 5...(35.40).

B(24), 42–37, 14-9, 33, 20, 10, 14 (5.44).

Свае лісты дасылайце на адрас: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а, "Шашкі".

Электронны адрас рэдакцыі: saf20016@yandex.ru або shulga.checkers@gmail.com.

Віктар ШУЛЬГА, міжнародны майстар спорту па шашачнай кампазіцыі.

ФУТБОЛ

Хто дагоніць БАТЭ?

Адбыліся матчы сёмага тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе.

Вось вынікі 7-га тура: "Шахцёр" (Салігорск) – "Крумкачы" (Мінск) – 0:2, "Нафтан" (Наваполацк) – "Слуцк" – 1:0, "Гарадзея" – "Віцебск" – 0:2, "Іслач" (Мінскі раён) – "Белшына" (Бабруйск) – 2:3, "Славія" (Мазыр) – "Мінск" – 6:2, , "Нёман" (Гродна) – БАТЭ (Барысаў) – 0:1, "Граніт" (Мікашэвічы) – "Дынама" (Мінск) – 1:1.

Турнірнае становішча

Каманды	Г	В	Н	П	М	А
1. БАТЭ	7	6	1	0	19–8	19
2. Іслач	7	4	1	2	10–8	13
3. Тарпеда-БелАЗ	6	3	2	1	8–5	11
4. Дынама (Мн)	7	2	5	0	10–6	11
5. Крумкачы	7	3	2	2	6–6	11
6. Мінск	7	3	1	3	10–11	10
7. Віцебск	7	3	1	3	8–4	10
8. Белшына	7	2	3	2	12–11	9
9. Граніт	7	1	5	1	7–6	8
10. Шахцёр	7	2	2	3	4–6	8
11. Гарадзея	7	2	2	3	3–5	8
12. Славія	7	2	2	3	9–11	8
13. Дынама (Бр)	6	2	1	3	9–13	7
14. Слуцк	7	1	3	3	4–9	6
15. Нафтан	7	1	2	4	3–8	5
16. Нёман	7	0	3	4	3–8	3

ЗОРНЫ ГОСЦЬ

Аксана МЯНЬКОВА:

«На «золата» не разлічваю…»

*Алімпійская чэмпіёнка па кіданні молата **Аксана МЯНЬКОВА** распавяла «Народнай Волі» пра допінгавыя скандалы, спартыўнае даўгалецце і пра тое, на якое месца яна разлічвае на Гульнях-2016 у Бразіліі.*

На Алімпіядзе 2008 года ў Пекіне Аксана сенсацыйна ўзяла «золата». Праз нейкі час пасля гэтага спартсменка нарадзіла дачушку Арыну і… праз тры тыдні пасля родаў ізноў пачала трэніравацца. Сёння кідальніца молата ўжо заваявала алімпійскую ліцэнзію і рыхтуецца да чарговых Гульняў.

– Пасля таго, як нарадзіла дачку, на Алімпіядзе-2012 у Лондане марыла заняць значна больш высокае месца, але атрымалася так, як атрымалася, – кажа Аксана. – Дарэчы, той вынік, што я паказала на Гульнях-2012, у Пекіне гарантаваў бы "бронзу". А ў Лондане апынулася толькі на 7-м месцы. Так што, як бачым, канкурэнцыя павышаецца.

– Не было жадання пасля гэтага сысці з вялікага спорту, заняцца сям'ёй, нейкімі ўласнымі справамі?

– Ведаеце, калі столькі гадоў прысвячаеш спорту ўсяго сябе, то ён робіцца часткай тваёго жыцця. Таму, калі шчыра, не было нават і думкі сысці.

– Спартыўнае даўгалецце ў кідальнікаў – нармальная з'ява?

– Безумоўна. Вы паглядзіце, колькі выступалі нашы спартсмены Ірына Ятчанка, Ігар Астапковіч. А кідальніца дыска Эліна Зверава наогул паказвала цуды на спаборніцтвах у любым узросце. Удзельніца пяці Алімпіяд, у 39 гадоў заваявала "золата" на Алімпіядзе ў Сіднеі! А на Гульнях-2008 у Пекіне, калі ёй было 47 гадоў, здолела заняць ганаровае 6-е месца. Хіба гэта не паказчык?!

– Адным словам, магчыма, Алімпіяда ў Рыа для вас і не апошняя?

– Паглядзім, як усё будзе складвацца. Мне хацелася б, каб яна была не апошняя.

– Вам калі-небудзь даводзілася выступаць на спаборніцтвах у Бразіліі?

– Ніколі. Адзінае што – нас загадзя папярэдзілі: дарога туды будзе складаная, гэтак жа як і акліматызацыя. Аднак, спадзяюся, на маім выступленні гэта не адаб'ецца. Ва ўсялякім выпадку на горшае сябе не настройваю, пакуль працую па сваім плане. Перадалімпійскі збор пройдзе на базе ў "Стайках", і адтуль адразу вылятаем у Рыа.

– Алімпійскі год для вас складаны?

– Звычайны, хіба што адчуваецца большая адказнасць за канчатковы вынік. Але ж да стартаў яшчэ некалькі месяцаў. Калі забіваць галаву ўсялякімі непатрэбнымі думкамі, то на трэніроўкі часу не застанецца.

– Медалёвыя планы?

– У кожнага ёсць індывідуальны план. У рэшце рэшт, трэба разумець свае магчымасці і сілы. Таму, безумоўна, можна паставіць завоблачныя задачы, а затым іх паспяхова праваліць. Які ў гэтым сэнс? Я, напрыклад, цудоўна разумею, што асабіста мне трэба зрабіць нешта неверагоднае, каб перамагчы сённяшняга лідара ў гэтым відзе спорту польку Аніту Владарчык і заваяваць залаты медаль. Дай Бог, каб увогуле зачапіцца за п'едэстал, але тут таксама не хацелася б забягаць наперад.

– Напярэдадні мінулых Алімпіяд некаторыя спартсмены скардзіліся на тое, што былі арганізацыйныя праблемы пры падрыхтоўцы да Гульняў. Магчыма, з гэтай нагоды і вам ёсць што сказаць зараз?

– Вось тут якраз-такі ўсё ў парадку. Кіраўнік федэрацыі Вадзім Дзевятоўскі, здаецца, робіць усё магчымае, каб лёгкаатлеты гэтых праблем не адчувалі. Зборы, дактары, масажысты, вітамінізацыя – усё гэта ёсць.

– Апошні час спорт скаланаюць скандалы, звязаныя з ужываннем спартсменамі мілдранату, які стаў забароненым з 1 студзеня гэтага года. Вас гэтае ліха абышло бокам?

– Я шчыра скажу: сама раней прымала мілдранат. І мне проста смешна, калі бачу, як пачалі змагацца з гэтым прэпаратам. Атрымліваецца, што ў нас 80 працэнтаў народа сядзіць на гэтым забароненым прэпараце. Спартсмены, бабулі і ўсе астатнія.

– Але ж бабулі не ўдзельнічаюць у Алімпіядах…

– Мілдранат – распаўсюджаны прэпарат для сэрца, галоўная задача якога – падтрымліваць чалавечы матор пры звышнагрузках, не даючы яго клеткам загінуць. Сам стваральнік мілдранату распавядаў, што прэпарат можа выратаваць спартсмена ад смерці на трэніроўках, але не здольны палепшыць яго вынікі. А зараз мілдранат чамусьці забаранілі. Не бачу ў гэтым ніякай логікі.

– Дарэчы, многія кажуць, што Беларусь у галіне спартыўнай фармакалогіі адстае ад многіх развітых краін, маўляў, няма добрых, высокапрафесійных айчынных спецыялістаў. А ў сучасным спорце перамагаюць не толькі спартсмены, але і развітая фармакалогія…

– Трэба сказаць дзякуй і за тое, што ёсць. Магло б быць і горш.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЧУЛІ?

Зборная Беларусі рыхтуецца да таварыскіх матчаў

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі Аляксандр Хацкевіч назваў імёны футбалістаў, якія будуць рыхтавацца да таварыскіх матчаў са зборнымі Паўночнай Ірландыі (27 мая) і Ірландыі (31 мая).

Як паведамляе прэс-служба асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», на трэніровачны збор, які пачнецца 23 мая ў Мінску, выклікаюцца 22 ігракі:

варатары – Андрэй Гарбуноў («Атраміпас», Афіны, Грэцыя), Сяргей Чэрнік (БАТЭ, Барысаў), Андрэй Клімовіч («Мінск»);

абаронцы – Дзяніс Палякоў, Максім Валадзько (абодва – БАТЭ, Барысаў), Ігар Шытаў («Мордовия», Саранск, Расія), Аляксандр Мартыновіч («Урал», Екацярынбург, Расія), Сяргей Палітэвіч («Генчлербірлігі», Анкара, Турцыя), Раман Бегуноў («Дынама», Мінск), Ягор Філіпенка («Малага», Іспанія), Міхаіл Сівакоў («Зара», Луганск, Украіна);

паўабаронцы – Сяргей Кісляк («Рубин», Казань, Расія), Станіслаў Драгун («Динамо», Масква, Расія), Ігар Стасевіч (БАТЭ, Барысаў), Міхаіл Гардзяйчук (БАТЭ, Барысаў), Павел Няхайчык («Томь», Томск, Расія), Аляксандр Глеб («Генчлербірлігі», Анкара, Турцыя), Сяргей Крывец («Мец», Францыя), Сяргей Балановіч («Амкар», Перм, Расія), Іван Маеўскі («Анжи», Махачкала, Расія);

нападаючыя – Сяргей Карніленка («Крылья Советов», Самара, Расія), Мікалай Януш («Шахцёр», Салігорск).

Нагадваем, абодва сапернікі беларускіх футбалістаў выступяць у фінальным турніры чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў Францыі з 10 чэрвеня па 10 ліпеня.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл. рэкламнага аддзела:
(017) 3286609
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

9 772071 964000 16037

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 16.05.2016 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26 070 экз. Заказ № 1719